НАСТАССЯ НАРЭЙКА

Тры лёсы

Апавяданні

Нарэйка Настасся нарадзілася 28 кастрычніка 1986 года ў Маладзечне. Скончыла Інстытут журналістыкі БДУ. Працуе адказным сакратаром Камянецкай раённай газеты «Навіны Камянеччыны». Аўтар кнігі вершаў «Магдэбургскае права маёй душы». Творы ўвайшлі ў калектыўныя зборнікі «Берасцейская скарбніца», «Сила слабости» і «ЛітАўра» (Брэсцкае аддзяленне СПБ), «Кахаць і верыць» (зборнік апавяданняў маладых пісьменнікаў), «Скажы, што кахаю» (зборнік прозы з серыі «Вера. Надзея. Любоў»). Лаўрэат літаратурнай прэміі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта імя Уладзіміра Калесніка.

Акно, намаляванае на сцяне

Ён быў мастаком. І аднойчы яго вельмі моцна пакрыўдзілі. Дакладней, не яго самога, а яго творчасць. Ён мог вытрымаць усё, дараваць усё, акрамя грэбавання самым святым, што было ў яго жыцці,— карцінамі. Ён сцярпеў бы любыя папрокі ў свой адрас, любыя злыя словы, звернутыя да сябе, але тое, што гаварылі пра яго карціны — злое, жудаснае, несправядлівае,— гэта было горш за ўсё. І ён не мог такога дараваць.

Ён сышоў.

Мастак зачыніўся ў маленькім пакойчыку, замураваў дзверы і вокны. Увесь свет яго звузіўся да гэтага куба. Роўныя сцены, столь, падлога... Ды яшчэ скрыня з фарбамі, пэндзлямі і палітрай. Быў таксама мальберт. Мальберт на дзвюх нагах, які здаваўся яму жывым. Часам мастак размаўляў з ім.

Ён маляваў. Увесь час. Здаралася, падхопліваўся ноччу, выцягваў з кута сваю скрыню — і ў ім прачыналася вялізная, нечалавечая сіла, якой раней ніколі ў сабе не ведаў. У такія моманты ён разумеў, што жыццё дадзена яму недарма, што ўсё ў гэтым свеце недарма. І яму рабілася лягчэй.

Начамі, калі натхненне сыходзіла, ён слухаў галасы за сценамі. У яго былі чатыры сцяны. За адной пастаянна чуліся сваркі і лаянка, за другой — смех, за трэцяй увесь час гучала музыка, а за чацвёртай нехта чытаў уголас белыя вершы. Цудоўныя белыя вершы... Ён не ведаў ні іх аўтара, ні таго, хто чытаў. Ён проста ведаў, што гэта цудоўныя белыя вершы. Прыкладаў вуха да сцяны і слухаў.

А потым зноў прыходзіў дзень. І зноў былі карціны. Ён ставіў іх радком ля сцяны, адной, затым другой, трэцяй і

чацвёртай. А праз некаторы час другі шэраг карцін закрыў першы. І яму ўпершыню ў жыцці стала страшна. Страшна, што тое, мінулае, згублена.

І тады ён зразумеў, што павінен паказаць свае карціны свету, павінен паспрабаваць яшчэ раз. Ніхто не абяцаў яму, што ўсё складзецца як мага лепш, ніхто не гаварыў, што ён пераможа.

Але ён павінен быў адчыніць, дакладней, прасекчы, як Пётр Першы калісьці, акно ў тое жыццё, з якога сышоў. Але свет такі вялізны і страшны! І таму ён вырашыў прасекчы акно хаця б у жыццё аднаго чалавека.

Ён доўга вагаўся, выбіраючы паміж трэцяй і чацвёртай сцяной. Паміж музыкай і паэзіяй. І выбраў паэзію, бо ў той вечар, прыціснуўшыся вухам да сцяны, ён пачуў радкі аб сабе самім.

> Я ушел.
> Это был единственный способ остаться —
> Хотя бы в памяти...
> Я ушел —
> И в моем окаменевшем сердце
> остановились часы[1].

І ён вырашыў, што будзе маляваць акно на гэтай сцяне, на чацвёртай. І ён маляваў яго. Вельмі доўга. Па чырвонай цэгле. Спярша з'явілася рама з цёмнага дрэва (менавіта такія вокны былі ў доме яго бацькоў, даўно-даўно, нібыта ў мінулым жыцці). Пасля ён намаляваў шкло. Здавалася б, як можна намаляваць шкло? Тое, што нябачнае? Але ён змог. Адна створка акна была прыадчынена, і ў яе ён убачыў вялізны свет, цудоўны і непаўторны, дзівосны.

Ён намаляваў за сваім акном лета, а потым яму здалося, што гэта няправільна, што лета — проста крок да восені, якую ён так не любіў. І мастак пераўтварыў лета ў вясну.

За яго акном цвілі яблыні пяшчотнай ружовай квеценню. Неба налівалася блакітам, зелянела трава.

Ён намаляваў сваё акно і той ноччу ўпершыню заснуў спакойным, а калі прачнуўся раніцай, адчуў на шчацэ дыханне вясновага ветру. І гэта было так нерэальна, так казачна, што ён яшчэ мацней заплюшчыў вочы, каб мара не знікла.

А потым раптоўна зразумеў, што адчуванні сапраўдныя! Ён устаў, навобмацак дайшоў да намаляванага акна, працягнуў руку і раптам... не адчуў сцяны. Не адчуў чырвонай цэглы. Чырвоная цэгла навобмацак зусім не такая, як шэрая ці карычневая. Ён ухапіўся дрыжачымі пальцамі за пругкую галінку, сарваў некалькі кветачак, паднёс да твару, і пах сапраўднага яблыневага квету прымусіў яго расплюшчыць вочы. Свет быў адчынены. Ён гэта ведаў. Ён ведаў цяпер, што варта толькі зрабіць крок... Але... у яго было акно... а не дзверы.

— Калі-небудзь я абавязкова намалюю дзверы,— падумаў ён.— Магчыма, заўтра. Я намалюю іх на той сцяне, за якой гучыць музыка — «Вясна» Вівальдзі. Я абавязкова намалюю яе і, магчыма, выйду са свайго пакоя...

Шыпшынавы дождж

1

Чым вышэй узнімалася яна на ўзгорак, зарослы папараццю, тым больш моцным рабіўся вецер. Доўгі падол сукенкі блытаўся ў нагах, капялюш даводзілася трымаць вольнай рукой (занятая ўжо прыціскала збоку папку). Вецер спрабаваў вырваць у яе эцюды, намаляваныя за апошнія некалькі месяцаў, але яна не збіралася так лёгка здавацца.

Навальніца вісела ў паветры, але дажджу ўсё не было. Толькі сухая маланка без звыклага апломбу крэсліла неба. Гром быў такі далёкі, што яго вуркатанне не выклікала страху.

Яна ўзнялася на вяршыню ўзгорка і літаральна захлынулася ветрам, які цяпер дзьмуў з усіх бакоў.

— Я трапіла ў сярэдзіну тайфуну,— падумала.

Капялюш сарваўся-такі з галавы і, узмахнуўшы ружовымі атласнымі стужкамі,

[1] Верш Карэна Джангірава.

як крыламі, паслухмяна паляцеў туды, куды нёс яго вецер. Яна нічога не адчула: ні шкадавання, ні злосці... Цяпер можна было трымаць папку аберуч і нічога не баяцца.

Калі сцяна ветру перад ёю пачала крыху расступацца, яна пабегла. Уніз з узгорка. Лёгка! Пругка! Упэўнена! Зямля пад нагамі перастала адчувацца.

— Вось як гэта — ляцець!

Яна хацела, да болю хацела раскінуць рукі, што крылы, але... папка.

Ля падножжа ўзгорка яе чакаў сустрэчны вецер. Некалькі не вельмі далікатных аплявух — і палёт спыніўся. Пачалося супраціўленне. Змаганне.

Валасы, якія больш не трымаў капялюш, распляліся канчаткова і ўзляталі ўверх. Яна адкідвала іх з твару і напружана працягвала прадзірацца праз вецер.

Кроў закіпела недзе глыбока ўнутры і цяпер імкліва бегла, абпальваючы вены.

Сухая папараць прасіла дажджу. Не проста дажджу — навальніцы!

Неба між тым заставалася абыякавым. Ніводнай асобнай хмаркі — суцэльная маса нечага шэрага і белага.

Ёй заўсёды падабалася такое надвор'е. Памежжа. Рыса, за якой і перад якой — проціегласці.

На верандзе яна скінула туфлі і выцягнула з кішэні звязку ключоў. Дом сустрэў сухім пахам шыпшынавага квету. Нават ён марыў пра дождж.

Шыпшына атачала яе дом з усіх бакоў.

Уладкаваўшы папку на стале, яна нагбом папіла са шклянога графіна. Смак быў салодкі, пах — ледзь улоўны, бярозавы.

2

Калі пачаўся доўгачаканы дождж, яна вярнулася на веранду. Пах шыпшыны стаў амаль невыносным. Цёмна-ружовыя кветкі гублялі пялёсткі. Калі правесці рукою па драўляных вільготных парэнчах, на далоні застануцца два, падобныя да кропель. Яны складуцца ў разбітае сэрца.

Мокра шапацела папараць, цяпер больш шэрая, чым зялёная.

Туга мяккай, але халоднай коўдрай легла на плечы. Яна абяцала, пужала і зачароўвала нечым трывожным. Хто б падумаў, што ў трывозе можа быць зачараванне!

Яна адчувала цяжар. І калі палілася з нетраў пустога дома тужлівая музыка, стала зусім немагчыма. Як ад паху мокрай шыпшыны.

Калені падагнуліся. Сукенка хваляй легла на падлогу. І слёзы. Яна не плакала з таго самага моманту, як упершыню пераступіла парог гэтага дома.

Музыка рвала душу на часткі. «Вальс» Хачатурана.

Апошнія гукі расталі ў імгле, а яна яскрава пачула шоргат аркушаў. Яе эцюды... Ласкавая рука перабірала іх. Вось — высокі бераг, вось — белыя каменныя прыступкі, што вядуць да возера, вось — квольая блакітная кветка, чые карані ўчэпіста трымаюцца за неўрадлівую, камяністую глебу.

Яна не магла падняцца, не знаходзіла сіл. Глуха адбівала хвіліны сэрца, нібыта ўнутры сядзеў снарад, гатовы выбухнуць.

Эцюды перасталі шамацець. Так змаўкае апалае лісце, калі канчаткова разумее: нельга вярнуцца ў вясну.

Ні музыкі, ні душы... Адны крокі недзе блізка. Перахапіла дыханне.

Яна адчула сябе маленькай жывёлінкай, якая жыве на свабодзе і нічога не ведае пра свабоду. Ілюзія...

Для таго, каб зразумець, каму належаць крокі, ёй не трэба было азірацца.

3

— Я знайшоў твой капялюш у папараці.

Яна лёгка паднялася, заплюшчыла вочы і пачала маліцца. Першы раз за тыя тры гады, якія правяла ў гэтым доме.

Як заклінанне, пульсавалі ў галаве словы: «Забяры мяне! Забяры мяне!»

Ён маўчаў, і гэта было самай горшай пакутай. Нашто тады прыехаў? Нашто ішоў за ёй насустрач ветру? Нашто падабраў сіратлівы капялюш? Нашто глядзеў

эцюды? І галоўнае: нашто, бязлітасны, іграў на старым фартэпіяна яе любімы вальс?! Не было адказаў.

Дождж стукаў у скроні, у заплюшчаныя вочы, у сэрца.

Яна не магла больш стаяць так. Набрала поўныя грудзі вільготнага паветра, шэрага, як папараць, і адным рэзкім рухам павярнулася да госця. Ён зусім не змяніўся. Толькі вочы сталі яшчэ больш глыбокімі.

— Відавочна, ты тут не для таго, каб тлумачыць.

— Відавочна.

І больш ні слова.

Дождж сціх, нібыта прыслухоўваўся да размовы людзей на верандзе.

— Для чаго ты тут?

Цішыня...

Ён бязгучна павярнуўся, каб пакласці капялюш на крэсла, падышоў бліжэй і асцярожна ўзяў яе за руку. Перавярнуў далонню ўверх і ўсміхнуўся. З цяжкасцю яна адарвала позірк ад вялізных сініх вачэй і апусціла галаву. На далоні трапятала цёмна-ружовае сэрца з пялёсткаў шыпшыны. Цэлае сэрца.

Рука задрыжала. А ён лёгка павярнуў яе за плечы да бясконцага свету. Яго запаланіў лёгкі і мяккі шыпшынавы дождж.

Яна ўсміхалася. І недзе ў глыбіні дома зноў іграла фартэпіяна.

Белы анёл над старой капліцай

1

Увесь курс спісваў лекцыі толькі ў яе. І прычынай таму было не тое, што яна наведвала іх усе і старанна занатоўвала, а тое, што яе напаўдзіцячы почырк з характэрным нахілам у левы бок мог расчытаць кожны.

Яна пісала хутка, зусім не скарачаючы словы, і так моцна ціснула ручкай на паперу, што старонкі сшытка закручваліся, нібыта высахлыя кляновыя лісты.

Лекцыі па гісторыі Беларусі яна любіла больш за іншыя. «Апошні падзел Рэчы Паспалітай»,— паўтарыла сама сабе Марына і, дапісаўшы, з уздыхам палёгкі паставіла напрыканцы сказа кропку. Яна паклала ручку на стол і колькі разоў сагнула і зноў выпрастала пальцы. Вочы прабеглі па аўдыторыі і міжволі спыніліся на чорнавалосай, крыху ўскудлачанай галаве хлопца, што соладка спаў на першай парце як раз перад кафедрай гісторыка.

«Гэта ж трэба,— з нейкай незразумелай зайздрасцю падумала Марына.— Ніякага сумлення!»

Віктар Іванавіч падышоў да спячага і лёгка крануў яго за плячо.

— Малады чалавек,— у вачах выкладчыка скакалі вясёлыя чарцяняты.— Я скончыў. Можаце прачынацца.

— Не будзіце ліха, пакуль спіць ціха,— выдаў нехта з апошняга рада, і ад рогату літаральна затрэсліся сцены.

Марына таксама смяялася да слёз. Гэтага чорнавалосага хлопца, што паспеў ужо прачнуцца і не разумеў, чаго гэта ўсе так весяляцца, сапраўды клікалі Андрэем Ліха. Даў Бог прозвішча!

— Ліха прачнулася,— канстатаваў Віктар Іванавіч.— Заўтра чакаю ад вас, спадар, вуснага адказу перад аўдыторыяй па разгледжанай тэме.— Ён кінуў позірк у бок Марыны і дадаў: — Спісваць раю ў Радкоўскай.

Пад усеагульны гул адабрэння выкладчык пакінуў аўдыторыю.

Каля гардэроба Андрэй схапіў Марыну за локаць і, адвёўшы ўбок, спытаў:

— Дасі спісаць?

Яна засмяялася, пазіраючы ў нечакана прыгожыя шэрыя вочы.

— Магчыма. Калі раскажаш, дзе ты ўчора ноччу сноўдаўся, каб пасля на парах адсыпацца.

— Цікавішся?

Яна жартам сунула яму ў плячо.

— Аей-аей! — Андрэй перахапіў яе руку.— Балюча, панечка, але добра ўжо, скажу. Маляваў я ўчора да паўночы.

— Маляваў?

Марына вызвалілася і крыху адышла назад, каб лепш разглядзець яго.

— Не верыш? А я ў мастацкую школу хадзіў. Выстава ў мяне была. Адна,— яго

вочы раптам пацямнелі, нібы на срэбра найшла іржа.

— Чаму ж гістфак?

— Доўгая гісторыя,— Андрэй усміхнуўся.— Бач ты: гістфак — гісторыя. Усё ў жыцці дзіўна. Дык дасі канспект?

Яна кіўнула і выцягнула з сумкі сшытак.

— Дзякую.

Ён пакланіўся напаўсур'ёзна-напаўжартоўна і пайшоў да дзвярэй.

2

Яна любіла май, бо гэта быў месяц квітнення, сонца і прадчування лета. Хутка экзамены.

На ганку было, як заўсёды, шматлюдна. Марына прайшла праз вясёлую, шумную гурму і сумна ўздыхнула. Вельмі не хапала Любкі. Але з каханнем, адзіным, непаўторным, таемным, з хлопцам, ад якога кругам ішла галава, і тым больш з будучым дзіцем нічога нельга было зрабіць. Марына помніла вяселле Любкі са Стасем на другім курсе. І вось — сяброўка ўзяла акадэмічны водпуск. Гісторыя ўсяго свету пачакае, калі перад тваімі вачамі распачынаецца гісторыя роднага твайго малога чалавечка, якога клічуць Сяргейкам.

Марына ніколі не ўмела зайздросціць, але Любкі ёй вельмі не хапала.

Толькі перад лекцыяй Віктара Іванавіча яна ўзгадала пра «спячае ліха» і свой сшытак. Давядзецца хлопчыку папацець. Прафесар Строгаў пытаць умее (нездарма ж прозвішча такое). Што ж, «мужна трымайся, юнак, на дапросе». А то забяруць замест камсамольскага білета студэнцкі.

Андрэй быў сёння яшчэ больш калматы, чым учора. Відаць, зноў не спаў, але цяпер ужо над канспектам.

— Ну што, спадар Ліха,— Віктар Іванавіч усміхнуўся,— «спасціглі прамудрасць» запісаў спадарыні Радкоўскай?

— Яшчэ як! — Андрэй кінуў гарэзлівы позірк у бок Марыны, а яна густа пачырванела.

— То кажыце.

Ліха стаў на кафедру і з самым сур'ёзным тварам, на які быў здольны, адтарабаніў усю тэму.

Аўдыторыя апладзіравала стоячы.

3

Ужо дома Марына выцягнула з сумкі вернуты Андрэем сшытак, і раптам з яго вывалілася нешта — роўны квадрацік паперы. Яна перавярнула яго і... засыла. Гэта быў малюнак, выкананы каляровымі алоўкамі. Яе партрэт. Сінія, вялізныя вочы (няўжо ў мяне такія?), доўгія, хвалістыя валасы колеру позняга мёду, крыху задзёрты нос, любімая аранжавая сукенка. Такая падобная да Марыны дзяўчына і такая непадобная.

У той вечар яна ўпершыню ў жыцці ўвогуле не рыхтавалася да заняткаў.

4

Першым паставілі экзамен па гісторыі Беларусі. Марына ехала ў тралейбусе на кансультацыю і планавала ў галаве свой расклад на наступныя тры дні, што ў яе заставаліся. 40 пытанняў. Больш чым па 10 на дзень. Та-а-ак... Яна ведала, што ўсё паспее, а чэрвеньскае сонца за празрыстым шклом акна гарэзіла і запрашала адпачыць...

— Відаць, пытанні скончыліся? — Віктар Іванавіч пачаў складваць аркушы ў папку.— Тады плёну вам у працы, панове.

Марына таксама пачала збірацца. Адна-групнікі вылецелі з аўдыторыі з хуткасцю ветру. Яна павесіла сумку на плячо, павярнулася да дзвярэй і ледзь не сутыкнулася з Андрэем.

— Хай на цябе ліха! — Марына перажагналася.— Ледзь да сардэчнага прыступу не давёў!

— Прабач,— ён выглядаў стомленым і, відаць, пакрыўдзіўся на яе словы.

— Прабач, Андрэйка. Ніякае ты не ліха...

— Я — ліха.

НІНА ЛІТВІНКА

Хачу быць шэдэўрам Тваім

Вершы

Літвінка Ніна нарадзілася ў Маладзечне 4 верасня 1990 года. Скончыла Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Займаецца фатаграфіяй і жывапісам. Піша вершы і прозу. Фіналіст Міжнароднага конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». Творы друкаваліся ў зборніку «Мой дзень пачынаецца», альманаху «Terra poetica» і іншых.

На спіне пчалы

Ляпі з мяне,
выдумляй,
аздабляй.
Я гліна.

Квась мяне,
замешвай у дзяжы,
рабі караваі, пампушкі
або круасаны.
Я цеста.

Тонкая,
нібы ўзмах
павекаў.
Пругкая, быццам
кладка ў вадзе.

Я моцная,
як вербалоз.
Пляці з мяне,
упрыгожвай
стужкамі, кветкамі,
нясі ў царкву,
кладзі на гарышчы.
На шчасце.
Буду тваім талісманам.

Перахапі мне
косы
сцяблінамі спелай
травы
і валошкамі сінімі.

Выпі ранкам
расу з мяне —
я гарлачык.

Налі малака,
здабытага на палях
Беларусі. Ці мёду.

Зрабі мяне рознай.
Я хачу быць

шэдэўрам Тваім,
Божа.

І пылам ля ног.

І пылком
на спіне
пчалы.

✦ ✦ ✦

У мяне да цябе — сад,
у мяне з табою любоў,
і адзенне нам — зарапад,
белы месяц вядзе дамоў.

У мяне з табою — камін
і дубовы надзейны стол.
Гэты стол — ад дзядоў напамін,
а камін — аддае нам цяпло.

У мяне з табою акно,
што глядзіць на палі вакол,
як бы холадна ні было,
не замерзне дашчэнту яно.

У мяне з табою дыван,
ўвесь ва ўзорах усходніх шатроў,
хай лютуе дзесьці буран,
дома ходзіш — цяплее кроў.

У мяне з табою альтанка,
апавітая вінаградам.
Надвячоркам прымае гулянку —
па-старэчы кожнаму рада.

У мяне ёсць гісторый прыпол,
столькі казак — не злічыш ўсяго.
Я за сёння прыдумала дом.
Мы за заўтра збудуем яго.

✦ ✦ ✦

Дарога да цябе гэта
дажджом заліты Таўэрскі мост
плывуць машыны як лодкі
і лодкі як машыны
выныраюць
між хваляў

калі не прайсці не праплыць не праехаць
я не ашчаджаю асадкі
на лісты да цябе

шаўковай стужкай віецца
прастора
там пралягаюць твае сляды
дарогі-пункціры
галінамі-стрэлкамі
абазначаюць мапу
занатоўваю яе ў сэрцы
найлепшым сейфе

з'ядаю шакаладку
каб добра запомніць

нашае шанцаванне

месяц як заўсёды
пралівае магнітныя буры
на зямныя залевы

між шалёных дажджоў
святлее раптам неба
ў сырна-жоўтай
поўні
бачныя два сілуэты
закаханых
нас.

Фота з архіва Н. Літвінкі

ВІКТОРЫЯ ЖЫТНІК

З нас такія сабе акцёры...

Вершы

Жытнік Вікторыя нарадзілася 19 кастрычніка 2004 года ў Мінску. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтарка паэтычных альманахаў «Альтанка», «аБДУмана» і «Маладая плынь».

✦ ✦ ✦

мы сыграем па ролях драму
з нас такія сабе акцёры
зробім выгляд што мы ніколі
адно аднаго не ведалі
імёны ў сцэнарыях сцёртыя
усе дзеі даўно прапісаныя
дыялогі на памяць вывучым
і ні слова не скажам правільна
так старанна ад праўды збягаем што
надта часта мяняемся ролямі
я не ведаю ў што гэта выльецца
з нас такія сабе акцёры
наша драма стане трагедыяй
мы пачнем наноў
з ролямі новымі

✦ ✦ ✦

восень пахне сырой зямлёй
пераспелымі яблыкамі
падгнілым лісцем
і табой

ты пахнеш какавай
фарбай для валасоў
парфумай
і нечым яшчэ пра боль

мой боль пахне жалезам
танным алкаголем
табачным дымам
і некім хто больш не ты

нехта пахне музыкай ці мастацтвам
нехта пахне чорнай кавай
нехта — блізкасцю
нехта — кветкамі
нехта — вішняй і салодкім цестам
збіраю цябе па іх

хтосьці пахне шчасцем
спакоем цяплом жыццём

хтосьці пахне вясной
а восенню пахнем мы

УЛАДЗІСЛАЎ ГРЫШЫН

Закон лесу

Апавяданне

Грышын Уладзіслаў нарадзіўся 10 лістапада 2005 года ў Мінску.
Студэнт першага курса факультэта міжнародных бізнес-камунікацый Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Удзельнік універсітэцкага дэбатнага клуба. Піша прозу, сур'ёзна захапляецца гісторыяй. Літаратурны дэбют у «Маладосці».

Яны ідуць ужо другі дзень. Калона з сарака мужчын. Узброеныя стрэльбамі жыхары прадмесцяў калоніі Лівільвіль крочаць па гэтых дзікіх землях скрозь волкія, брудныя лясы нязведанага Паўночнаамерыканскага франціра ўжо другі дзень. Навошта ж яны адправіліся ў гэтае небяспечнае падарожжа? Куды ідуць? Чаму пакінулі свае ўтульныя дамы і сем'і, а самі мерзнуць пад восеньскім ветрам і спяць на халоднай зямлі? Такімі пытаннямі задаваўся амаль кожны з іх. Акрамя Гары Гаральдсана. Гэты таўстун стаяў на чале іх атрада. Высокі, укормлены, з доўгім носам і вялізнымі, як у слана, вушамі, ён адзін не выяўляў прыкмет стомленасці. Ён жа гэты паход і распачаў. Багаты фермер, чые землі знаходзяцца на заходняй ускраіне Лівільвіля, як і ўладанні большасці ўдзельнікаў паходу (таксама фермераў), ён зазнаў адчувальныя страты і гэтак жа пацярпеў ад нядаўняга рэйду індзейцаў-кры. Усе яны нешта страцілі: жывёлу, пасевы ці прылады. Але ў Гаральдсана забралі штосьці больш каштоўнае: індзейцы выкралі яго жонку Ізабэлу, цудоўную маладую цёмнавалосую крэолку з Фларыды, якая стала другой жонкай Гаральдсана. Яго першая жонка памерла паўгода таму, зімой праваліўшыся пад лёд слаба замёрзлага ляснога возера недалёка ад Лівільвіля. Ужо тры месяцы, як Гары быў абвянчаны з Ізабэлай, і то быў час ціхага шлюбнага жыцця. Як мінімум так пра іх усе казалі. І вось, калі ўсе абмяркоўвалі ў ратушы нападкры, ён і выступіў з ідэяй напасці на атрад індзейцаў і вярнуць усё, што яны забралі.

— Навошта мы толькі паслухаліся гэтага таўстуна? — задыхаючыся, пытаўся фермер сярэдняга дастатку Джэк Сміт, ідучы ў цэнтры калоны і папраўляючы свой заплечнік і стрэльбу.— Лепш бы дома сядзелі зараз са сваімі сем'ямі. Адбудавалі б усё. А цяпер? Цяпер мы ідзём бог ведае куды за гэтымі дзікімі чар-

цямі дзеля нейкага хламу, што яны забралі.

— Гаральдсан не з-за свайго дабра за індзейцамі папёрся,— адказваў яму сябар-француз, бывалы трапер[1] Жак Партэр, наняты Гары для паходу. Ён ішоў злева ад Джэка.— Таўстун за жонкай сваёй ідзе, за той Ізабэлай.

— Ды наплявaць мне на яго, Жак! Я не разумею, як ён нас на гэта ўламаў! — рэзка ўсклікнуў фермер.

— Але не збіраешся ж ты зараз павярнуць адзін дадому, Джэк?

— Чаму адзін? Я ўпэўнены, што тут шмат такіх, як я. Трэба толькі, каб нехта гэтую ідэю прапанаваў на прывале...

— Ты чаго ныеш, як дзеўка, Джэк? А? — крыкнуў на яго стары Джэнкінс. Схапіўшы стомленага каланіста за руку, ён працягнуў: — Калі ты хочаш уцячы і ісці назад адзін скрозь гэтыя нетры, то лягчэй будзе мне адразу прыстрэліць цябе на месцы. Гэта будзе лепш, чым быць загрызеным грызлі. Толькі іншым не скуголь у вушы, а то я цябе і так застрэлю, як вашывага сабаку.

— Не чапай мяне, брудны стары! Чаго ты ад мяне хочаш? Ты ўвогуле не фермер... Якая справа табе да нашых індзейцаў? Навошта з намі ўвязаўся? Вунь у цябе нават стрэльба ад старасці ў няспраўную кульбаку ператварылася!

— Я табе сказаў, малеча, калі будзеш яшчэ ныць і падбіваць вярнуцца, то я са сваёй «Бэтсі» цябе куляю пачастую...

— Хлопцы, спакойна. Давайце супакоімся. Ніхто нікуды не ідзе, усё ў парадку,— паспрабаваў разруліць канфліктную сітуацыю практычны француз.— Памятайце: мы зараз адны ўдалечыні ад дома, а індзейцы і дзікія жывёлы блізка. Сваркі зараз да дабра не давядуць.

Выскаліўшы свае гнілыя зубы і пацягнуўшы ўніз свой зношаны капялюш, стары злосна зірнуў на Джэка Сміта і, смачна плюнуўшы яму пад ногі, пайшоў наперад.

— Стары сярун! — сказаў з сабачым аскалам фермер, гледзячы ўслед Джэнкінсу.

— Ды добра табе. Ён жа сапраўды мог цябе прыстрэліць, ты ж ведаеш, што ад гэтага шаленца ўсяго можна чакаць.

Стары Джэнкінс — пажылы ветэран адной з войнаў. Калісьці на яго атрад напалі індзейцы ды перабілі ўсіх. Толькі яму пашанцавала выжыць. Убачаная жорсткасць, з якою абарыгены расправіліся з яго людзьмі, так шакіравала Джэнкінса, што з тых часоў ён люта ненавідзеў усіх чырванаскурых і не прапускаў магчымасці сабраць як найбольш трафейных пёраў з галоў забітых карэнных жыхароў амерыканскага кантынента. Свае трафеі ён ганарліва насіў у вялізным звязку на поясе. Пазней з-за маніякальнай прагі помсты туземцам ён страціў усё: сяброў, сям'ю, працу. У асноўным ён зарабляў у розных месцах, працуючы вартаўніком. Адзінае, з чым ён ніколі не разлучаўся, была старая стрэльба, якую ён называў «Бэтсі» і часам нават размаўляў з ёю, як з жывым чалавекам. Жыў ён бедна, а ўсе зароблены грошы звычайна прапіваў у салунах ды іншых піцейных установах. Тым не менш усё гэта толькі пагоршыла яго душэўны стан — ва ўсіх сваіх бедах ён па-ранейшаму вінаваціў індзейцаў. Нібы ваўка, што выгналі з чарады, усе пазбягалі яго. З тых часоў Джэнкінс і ператварыўся з моцнага ваўка ў самотнага адзінокага бруднага шакала-валацугу. Ён ніколі не пакідаў сваіх надзей паўдзельнічаць у вялікім паходзе на індзейцаў. І калі тыя кры напалі на Лівільвіль — надышла яго зорная гадзіна. Як жа гэты стары вар'ят радаваўся, бачачы слупы дыму ад падпаленай маёмасці суседзяў, і як жа Джэнкінс быў шчаслівы на сходзе ў ратушы, дзе Гаральдсан заклікаў усіх да карнага набегу ў адказ...

Нечакана калона спынілася.

— Містар Партэр, містар Гаральдсан кліча вас да сябе,— падбег да француза малыш Білі Уотсан па мянушцы Мышаня.

— Добра, хадзем,— коратка адказаў Жак.

[1] Траперы — назва канадскіх паляўнічых, якія лічыліся добрымі следапытамі і з'яўляліся аднымі з першых даследчыкаў сучаснай тэрыторыі Канады і поўначы ЗША.

Малыш Білі — Уільям Уотсан... Усе ў Лівільвілі звалі паміж сабой яго Мышанём. Аднак называлі яго так не толькі з-за маленькага росту, але і праз іншыя яго прыкметы і норавы. Гэты замкнёны, худы, сутулы і заўсёды маўклівы і ціхі сакратар Гары Гаральдсана аддаваў перавагу адзіноце. Пагаворвалі, што, нягледзячы на свае англійскія імя і прозвішча, быў ён родам з нейкай іспанскай карыбскай калоніі. Працаваў Мышаня ў Гары амаль паўгода. У вольны час і ў святы ён ніколі ні да каго не хадзіў і нікога да сябе не клікаў. Без пільнай патрэбы нават не пакідаў сваё трухлявае жыллё, якое нагадвала халупу. Выключэнне складаў толькі любімы салун. Там ён звычайна сядаў адзін за маленькі стол у куце і выпіваў роўна адну пінту піва. Потым самотна вяртаўся ў сваю нару з нязменнымі строгасцю і сумам на твары.

— А вось і ты, Мышаня! — прарычэў цяжкім голасам таўстун Гаральдсан, убачыўшы, як сакратар, выконваючы даручэнне, ужо падводзіць пакліканага трапера да свайго боса.

Нягледзячы на тое, што ўсе між сабою называлі Уотсана па мянушцы, ніхто не клікаў і не называў яго так пры ім самім. Ніхто, акрамя яго вушастага тоўстага боса. Але насамрэч тыя ж «Мышаня» ці «Мыш» былі не самымі бяскрыўднымі імёнамі, якімі гаспадар клікаў Білі. З боку іх стасункі заўсёды выглядалі як адносіны рымскага патрыцыя да свайго раба, нікчэмнага і нявартага ўвагі.

Жыхары Лівільвіля не маглі зразумець, чаму Білі трывае зняважлівыя прыніжэнні. Хтосьці казаў пра вялікі заробак, для якога не грэх і прыніжацца. Але калі Уотсан і меў грошы, то сам жыў вельмі небагата. Яго дом у Лівільвілі патрабаваў рамонту, яго правільней было б называць развалюхай. Але гаспадар ніколі нічога не мяняў, нават сам хадзіў толькі ў старым залатаным адзенні, амаль заўсёды няголены. Ды і грашыма ён ніколі не раскідваўся.

— Сэр, я прывёў да вас містара...

— Так-так-так, Мышаня, я зразумеў. Можаш ісці,— груба адказаў Гары.

— Хм-м,— ціха вымавіў Білі.

— Навошта я табе патрэбен, Гаральдсан? — спытаў француз.

— Пантэр! Бачыш той яр? — сказаў таўстун, паказваючы на глыбокую расколіну, па якой струменіўся шырокі і хуткі ручай.

— Я Партэр, а не...

— Ай! Вас, французаў, не зразумееш! Не пра гэта цяпер — бліжэй да справы: я чуў, што такі трапер, як ты, можа забрацца на любое дрэва і пераскочыць па галінках на іншае! Гэта праўда?

— Так, думаю, я змог бы гэта зрабіць.

— Ну, і выдатна. Кідай сваё дабро на зямлю, хапай сякеру і скачы туды. Як злезеш, дык ссячы тое дрэва — яно ўпадзе на расколіну, і мы зможам па ім перайсці ўсе разам.

— А пашукаць брод нельга?

— На гэта няма часу, інакш сапраўды не нагонім гэтых дзікуноў. Мы і так далі ім фору на мінулай пераправе. Добра, што хоць ты і іншыя паляўнічыя іх сляды адсочваць можаце.

— Эх, добра.

Жак скінуў заплечнік і паклаў на яго свой капялюш. Ён дастаў з-за пояса сякеру і, сціснуўшы яе ручку зубамі і агаліўшы драпежныя іклы, палез на дуб Келага, які стаяў побач. Забраўшыся на галіну дрэва, якая магла б яго вытрымаць, француз стаў на ёй. З грацыяй дзікай кошкі паляўнічы пераскочыў на галіну другога дуба, што стаяў на супрацьлеглым баку яра. Ужо там хутка злез уніз і, убачыўшы іншы малады дубок, пачаў секчы яго. Праз якую гадзінку дрэва павалілася, утварыўшы мост для пераходу каланістаў.

Гаральдсан нешта груба загадаў Мышаняці. Сакратар, сумна ўздыхнуўшы, падняў рэчы Жака, трымаючы пры гэтым і свае, а таксама частку рыштунку боса, і першым пайшоў праз небяспечны яр па новым мосце. Пакуль ён ішоў, несучы груз, дастаткова цяжкі для яго габарытаў, усе назіралі, наколькі добра трымае паваленае дрэва чалавека.

— Табе не страшна за свае рэчы, Гаральдсан? — запытаўся нехта з атрада.

— Не-а. У яго там асабліва каштоўнага нічога няма. Усё ў мяне. А звaліцца, дык

паднімем, а калі нешта зламае, то вылічу з яго заробку!

— А калі ён упадзе і зламае што-небудзь сабе? Ты пра гэта падумаў?

— Ну-у-у... Ён жа дробны, спадзяюся, неяк пры падзенні вывернецца...

Перайшоўшы на другі бок, Білі ўручыў Партэру яго рэчы.

— Дзякуй,— сказаў француз Мышаняці.

— Хм, няма за што... — неяк недаверліва і ціха адказаў Уотсан.

І адразу па новым мосце пачалі свой рух астатнія. Затым атрад гараджан і фермераў Лівільвіля ішоў па лясных сцежках яшчэ паўдня да самага вечара.

Як толькі сцямнела, вырашылі ладзіць прывал і сталі разводзіць маленькія вогнішчы. Каланісты пачалі даставаць цюкі для сну і цёплыя коўдры. Усе падзяліліся на некалькі груп, якія павінны былі дзяжурыць кожныя дзве гадзіны і папярэдзіць астатніх у выпадку небяспекі. Замест сябе багацейшыя адпраўлялі сваіх работнікаў або прыслужнікаў. Мышаня не быў выключэннем і павінен быў стаяць на варце не дзве, а чатыры гадзіны — за сябе і свайго гаспадара Гаральдсана.

— Вось што ні кажы, а Паўночная Амерыка — зямля, вядома, дзіўная: зімы тут такія, што за межамі селішчаў і выратавацца ад холаду цяжка. І як гэтыя дзікуны толькі ў сваіх палатках на такім марозе спяць?! А лета якое! Душна і вільготна! Перш холадна, потым горача, як у пекле. Нават на маёй Ямайцы не так душна, як тут улетку. А потым што? Увесь час волка і дажджліва, усё ператвараецца ў нейкую дрыгву! Або мёрзлае, або багністае,— скардзіўся Джэк свайму новаму сябру-траперу, стоячы на пасту недалёка ад лагера.

— Слухай, калі табе гэтыя мясціны так не падабаюцца, то навошта ты сюды пераехаў? — спытаў Жак.

— З-за піратаў і іншых бандытаў! На астравах зямлі ўсім вечна не хапае — кожны кагосьці ды рабуе. У нас там заўсёды такія парадкі былі: моцны есць слабага. Як жывёлы... Але я не хачу быць дзікуном: рабаваць і забіваць. А як там стаць сумленным фермерам, калі ты не сынок якога-небудзь багацея са Старога Свету або губернатара? Немагчыма. Тут хаця б закон паважаюць. Калі зямля твая, хоць і дрыгва, дык яна заўсёды твая, і ніхто твае пажыткі не забярэ,— адказаў Сміт.

— Закон?! Ха-ха-ха! Не смяшы мяне. Які закон? Толькі калі закон лесу!

— А што за закон лесу?

— Ды тое ж самае, што і ў вас на Ямайцы: моцны есць слабага, неяк так,— выказаўся француз і паклаў руку на плячо Джэка.— Глядзі! Мы ў лесе — яго насяляюць ваўкі, мядзведзі і іншыя драпежнікі. А горш за ўсё, калі з індзейцамі сустрэнешся. Яны і добрыя бываюць, але калі на агрэсіўных напорашся, накшталт тых кры, то цэлым тваё нежывое цела сапраўды не знойдуць ужо, павер. І вось уяві, што кожны з іх можа да цябе на ферму ўварвацца і ўсіх забіць. А? Дык вось тых жа бандытаў ды іншых падобных ім у нас таксама хапае. Зірні на таго ж Гаральдсана. Нібы і сумленны чалавек, але ніхто не ведае, кім ён быў да пераезду ў Лівільвіль і як зарабіў сваё багацце. А жонка ягоная першая, што памерла ў тую зіму! Табе не здалося незвычайным, што яе змёрзлы труп знайшлі на беразе ляснога возера? А мяне гэта дзівіць, нават вельмі.— Тут ён паглядзеў па баках і прыгнуўся да вуха Джэка, а потым, яшчэ раз агледзеўшыся, шэптам працягнуў: — Мне неяк расказваў адзін з трунароў у карчме, што ЁН нават на пахаванне не прыйшоў. І як быццам бы нябожчыца расказвала, што да яе смерці ЁН для яе нейкі сюрпрыз у лесе хацеў зрабіць. Разумееш, што я маю на ўвазе?

— Ды ну цябе. Паглядзі на Гаральдсана — сланапатам і таўстун. Слон тоўсты, ды і толькі. Ну які з яго забойца-разбойнік? А наконт чутак ад трунара — дык, можа, на пахаванне не прыйшоў па нейкіх важкіх прычынах. Гары ж прадпрымальнік, а такія паны — людзі занятыя. Ды і да таго ж усе ведаюць, што як толькі Ізабэла ў нас аб'явілася, ён яе заўважыў і адразу сваю першую жонку разлюбіў. Можа, ад гора тая і кінулася ў ваду...

АЛЕСЬ СТРУЖКО

Адзінота мая, адзінота...

Фота М. Беларэцкага

Вершы

Стружко Алесь нарадзіўся 19 сакавіка 1999 года ў Мінску. Навучаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «Менеджмент міжнародных культурных сувязей». Піша вершы. Жыве ў Мінску.

Камякі

У нязрушнай пустэчы,
У пустэчы глухога задушша
Выспяваю зямлёю
знутры.

На чырвонай абгортцы,
На абгортцы ад смажаных дзён
Чорнай крэйдай пішу
камякі.

Чорнай крэйдай пішу,
Крэйдай-ціскам выпісваю словы,
Што вужакай забіліся
ў грудзі:

камякі,
камякі,
камякі.

Цяжкім дымам бруяць,
Дымам спаленых мар,
Гэтых попельных слоў
карані.

Срэбным жахам гудзяць,
Жахам збітых надзей,
Тых зламаных гукаў
званы.

І зноў рвецца ў горле,
Рвецца ў горле мацней.
Набрыняю зямлёю
знутры.

Чорным горлам пішу,
Горлам-крэйдай, хутчэй!
Каб дыханне пазбавіць
тугі:

камякі,
камякі,
камякі.

НАТАЛЛЯ СВЯТЛОВА

Гукі дажджу

Вершы

Святлова Наталля нарадзілася 11 сакавіка 1989 года ў горадзе Івацэвічы Брэсцкай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе загадчыкам аддзела літаратурнага рэдагавання РВУ «Выдавецкі дом «Звязда». Лаўрэат рэспубліканскага творчага конкурсу «Залатое пяро» ў намінацыі «За лепшую работу ў мастацка-публіцыстычных жанрах», рэспубліканскага конкурсу «Пад знакам Года малой радзімы» і інш.

Дождж

Цымбаламі — гукі дажджу:
То скокам, то быццам легата
Нябёсы раскрылі душу —
Сыплюць пасажы для тактаў.

Фортэ: па струнах ляцяць
Моцныя кропелькі-ўдары.
Лівень, і слёз не суняць,
Коцяцца з небнага твару.

Хлёстка мелодыя мкне,
Пераўзыходзіць крэшчэнда,
Добра сачыць у акне
Партыю песенькі меднай —

Слухаю: быццам гучыць
Туба, а можа, валторна?
Дожджык імжою шуміць,
Кропіць тугу тваю спорна.

✦ ✦ ✦

Рана зацягваецца хутка
на целе.
А як у душы?
Там сораму паўным-паўнютка
і колюць думкі-ледзяшы:
Дакор сабе, папрокі іншым,
і рана даўняя баліць.
Ці хто б сказаў, якое
зелле
прыкласці мне
да дзір душы?
Гадамі пошукаў бяссільных
лёс скіраваў да Кнігі кніг.
Зірнуў Настаўнік з яе пільна:
«Я ДАРАВАЦЬ вучыў усіх».

І зелле больш я не шукаю,
і рана, што ў душы, прайшла,
і дзіры зніклі.

ПЯТРО ЖАЎНЯРОВІЧ

Вясельны падарунак

Апавяданне

Жаўняровіч Пятро нарадзіўся 2 студзеня 1959 года ў вёсцы Азярэц Вілейскага раёна. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта працаваў выкладчыкам у Мінскім прафесійным каледжы электронікі і Беларускім дзяржаўным універсітэце. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Аўтар зборніка паэзіі «Расторганая прастора», дзвюх манаграфій, «Даведніка па літаратурнай праўцы», дапаможнікаў па рэдагаванні. Пераклаў на рускую мову творы Уладзіміра Караткевіча, на беларускую мову — раман Фёдара Дастаеўскага «Браты Карамазавы» і інш.

Восеньскія стракатыя фарбы разліваліся па раскідзістых дрэвах прысад, якія цягнуліся амаль сто метраў ад шашы да старадаўняй сядзібы, што месцілася за пятнаццаць кіламетраў ад Мінска і цяпер была прыстасавана руплівымі гаспадарамі для правядзення разнастайных урачыстасцяў: дзён нараджэння, карпаратываў, вясельляў... Асабліва раскашавалі кляновыя шаты: сваімі колерамі ад светла-лімонных да цёмна-барвовых яны стваралі ўражлівы незабыўны калідор, на які, гучна сігналячы, вырульвала калона ўпрыгожаных стужкамі і кветкамі аўтамабіляў. Першыя, зразумела, былі найкруцейшыя «мерсэдэсы» і «аўдзі», а за імі — менш ураганараваныя значнасцю «фальксвагены», «вольвы», «пежо» ды іншыя народныя маркі.

Бацькі, сужэнцы Герасімовічы і Палавецкія, ужо стаялі на ганку: прыехалі раней, пакуль моладзь, крыху абвяселеная шампанскім у загсе, наведвала разнастайныя лакацыі ў горадзе, абраныя і апрабаваныя фатографамі дзеля атрымання найлепшых здымкаў і найбольшага даходу. І бацькі маладога — вясковага хлопца Віталя, і бацькі маладой — гарадской дзяўчыны Хрысціны, зразумела ж, хваляваліся і былі па-святочнаму ўзрушаныя. Што ні кажы, а вяселле ў кавідных умовах — рэч клопатная ўдвая, складаная і нязвычная... Некаторыя нават блізкія сваякі наадрэз адмовіліся ад запрашэння на вяселле, а тыя, хто перахварэў, адчуўшы на сабе ўсе цяжкасці ачуньвання, перасцерагаліся яшчэ раз апынуцца ў лякарні.

Затое моладзі была раскоша!.. Цёплы кастрычніцкі дзень 2020 года дазваляў апусціць шыбы ў машынах, і размаітыя выгукі чуліся то з адной, то з другой, то з трэцяй. Але ўсё ж іх глушылі клаксаны, якія, нібы стаміўшыся ад забароны гучаць у горадзе абы-калі, на поўную моц раз-

разалі восеньскае паветра, палохаючы ў прысадах тых птушак, што не адлятаюць у вырай. У кабрыялетах (іх было два) узняліся дахі, маладыя людзі ўскочылі на поўны рост, ускідвалі ўверх рукі, абдымаліся і цалаваліся. Не было сярод іх розных там хіпстараў — былі звычайныя беларускія хлопцы і дзяўчаты, звыклыя да выканаўцаў расійскай папсы і такіх жа рэпераў, песні якіх запаланілі густы цяперашняй індустрыі забаў.

Да бацькоў набліжалася працэсія, якая станавілася важным складнікам вяселльнай урачыстасці, павінна была запомніцца і ім, і маладой сям'і, што стварылася ў гэты дзень. Колькі патрачана часу, нерваў і грошай, каб усё правесці на ўзроўні!..

...Бацькі Віталя, Кастусь Васільевіч і Ганна Макараўна Герасімовічы, выглядалі стомленымі, але трымаліся годна. Старэйшага сына ажанілі, дачку аддалі замуж, дык і на жаніцьбу малодшага Віталя, як кажуць, высільваліся. Ганна летам, пасля працы, праводзіла ўвесь вольны час у лесе, каб зарабіць якую капейчыну. Усе дзівіліся, як гэта яна можа ў чэрвені сабраць васьмілітровае вядзерца суніц, калі некаторыя за такі ж час блукання па палянах ледзь напаўнялі трохлітровае. А пра чарніцы ў ліпені, пра лісічкі з чэрвеня па верасень і казаць няма чаго... Кастусь таксама, калі выпадала вольная хвілінка, шабашыў на рамонце лецішчаў, якіх у прыбярэжнай зоне паўнаводнай рэчкі ўсё большала. Сярод іх гаспадароў былі грашавітыя, якія за якасную працу (а ў гэтым можна было не сумнявацца, бо Кастусь сам будаваў сямейнае гняздо ў аграгарадку Доўжыцы) і плацілі адпаведна.

Ды што казаць... Цяжкай працай да знясілення, сваім гарбом — нездарма народ гэта замацаваў у памяці — на вялікія грошы не ўзаб'ешся. Так, сабралі грошы на вяселле — недзе тры тысячы долараў — і такую ж суму адклалі на падарунак. Ранейшых запасаў не было, усё ж два вяселлі таксама нядаўна зладзілі. Вясковае жыццё адметнае харaством навакольнай прыроды, але ж яго не пакладзеш у кішэню як матэрыяльны дастатак...

Віталь з маленства не адыходзіў ад бацькі, калі той рамантаваў то свой легкавік, то мотаблок. Рукасты ўрадзіўся хлопец: за што ні возьмецца, усё зробіць дасканала на радасць бацькам. Адвучыўся ў каледжы, атрымаўшы кваліфікацыю электратэхніка...

Пазнаёміўся Віталь з Хрысцінай два з паловай гады таму на вячэрніх танцах у Доўжыцах: дзяўчына прыехала пагасцяваць да сваёй вясковай сяброўкі. І спрацавала, як сёння кажуць навукоўцы, а за імі ўсе ахвотныя, «хімія»: маладых людзей як магнітам цягнула адно да аднаго. І не дзіўна, што праз год бацькі Хрысціны наведаліся да Віталя, каб пазнаёміцца з яго сям'ёй.

Потым Кастусь па-мужчынску даверліва пытаўся ў сына:

— Віталік, як на мой розум, занадта ганарлівая сямейка ў тваёй абранніцы. Ці не памыліўся ты?

— Тата, зразумей, гэта, відаць, маё наканаванне... Не бывае дня, каб я не думаў пра Хрысціну. Кахаю яе да самазабыцця.

Што ж заставалася рабіць? Герасімовічы не хацелі пераконваць сына, каб у далейшым не чуць папрокаў: «Вы парушылі маё шчасце!..» На дварэ ж дваццаць першае стагоддзе, некаторыя пары гадамі жывуць у так званым грамадзянскім шлюбе, а тут да гэтага не дайшло, трэба прымаць выбар Віталя.

...Бацькі Хрысціны, Максім Валер'евіч і Надзея Іванаўна Палавецкія, чакалі, задаволеныя і ўзрушаныя дасканаласцю рытуалу, за які давялося аддаць фірме-арганізатару немалую суму. Палавецкі, які яшчэ на пачатку нулявых наладзіў прыватную майстэрню па рамонце легкавікоў, сёння меў некалькі сваіх філій у розных раёнах Мінска. Што б ні казалі пра цяжкасці ў працы прыватнікаў, але ўдала разлічаны бізнес-план і карпатлівая праца з персаналам далі адчувальны вынік. Ужо ў 2010-м сям'я набыла вялікую кватэру на два ўзроўні, а да 2015-га пабудавала і двухпавярховы дом недалёка ад Мінска, дзе жыла ўсе цёплыя месяцы года.

Максім у размовах часта казаў сваёй дачушцы пра адказнасць выбару свайго

МІХАСЬ ПАЗНЯКОЎ

Красой азораны паэт

Вершы

Пазнякоў Міхась нарадзіўся 24 студзеня 1951 года ў вёсцы Забродзе Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў філфак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў настаўнікам у школах Бярэзінскага раёна і Мінска, навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства АН Беларусі, дырэктарам Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, галоўным рэдактарам выдавецтва «Юнацтва», часопісаў «Вожык», «Нёман», намеснікам дырэктара РВУ «Літаратура і мастацтва». З лістапада 2005 года — старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар больш як ста кніг паэзіі, прозы, публіцыстыкі, крытыкі, перакладаў, слоўнікаў, навукова-пазнавальных кніг для дарослых і дзяцей. Ганаровы грамадзянін Быхаўскага раёна. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, літаратурных прэмій імя П. Броўкі, Я. Маўра, В. Віткі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, трох Рэспубліканскіх прэмій «Лепшая кніга года» і інш. Лаўрэат міжнародных літаратурных прэмій імя В. Біянкі, М. Гогаля, Р. Скаварады, Г. Бёля, А. дэ Сент-Экзюперы, Ф. Пятраркі, М. Твэна ды інш. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, мае іншыя дзяржаўныя ўзнагароды.

✦ ✦ ✦

У час спакус і адступленняў,
У век разбою і маны
Гаюся прагай летуценняў,
Святымі крыламі вясны.

Жыву высокім словам таты:
«Шчыруй і вер, і не хлусі!..» —
Шчаслівы, шчыры і багаты:
Ёсць Бог на Белае Русі.

І не паставіць на калені
Яе ніякім груганам,
Пакуль да Боскага ў імкненні
Мы будзем вернымі бацькам.

✦ ✦ ✦

Мне па-ранейшаму балюча
(Як у маленстве і было),
Душу гнятліва і пякуча
Людское ахінае зло.

Але ганю прэч боль і звады.
Сам-насам дзесьці ў глыбіні
Да чуйных слёз бываю рады
Людской гаючай дабрыні.

✦ ✦ ✦

Вось і наша радзімая хата.
Як сама, адчынілася брама.
Праз акно мне ўсміхаецца тата,
І насустрач спяшаецца мама.

Ах, якая яна маладая!
Васільковая вочы праменяць.
Я матулю хутчэй абдымаю...
Прачынаюся ў гэта імгненне.

І што сон мне прысніўся, не веру!
Пазіраю, нібы вінаваты.
І ўсё мрою: адчыняцца дзверы,
Прыпаду я да мамы і таты.

✦ ✦ ✦

Усё часцей мне хочацца дамоў,
Дзе наша хата госця выглядае,
Дзе тата ўсё шчыруе ля вуллёў,
Дзе мама поле грады, маладая.

І мроіцца наш самавіты сад,
І быццам вее радасцю наўкола...
Шкада, што не вярнуцца мне назад,
Да той часіны сонечна-вясёлай.

Там разам наша дружная сям'я,
Балючых страт яшчэ няма ў паміне,
І ліпы так пяшчотліва звіняць,
І бегчы ўдаль так лёгка па сцяжыне.

✦ ✦ ✦

Ад Вашай сонечнай усмешкі
Цяплеюць хутка халады,
Між снегу мрояцца пралескі
І ў белай квецені сады.

Вачэй святлістыя паляны,
Калі квітнеюць прада мной,—
Я хараством зачараваны
І чысцінёй іх незямной.

Як песня жаўры па-над жытам,
Пяшчотна голас Ваш звініць.
Вы з мары казачнай нібыта
Узніклі сэрца загаіць.

І я ляту, шчаслівы самы,
Красой азораны паэт.
Я кожны міг, заўсёды, з Вамі,
Бо Вы запоўнілі ўвесь свет.

✦ ✦ ✦

Дарыце, дарыце каханым
Найшчырых пралесак цяпло,
Духмянай чаромхі фантаны,
Начэй салаўіных святло.

Дарыце, дарыце каханым
Лагоду мелодый лясных.
Сузор'яў загадкавым ззяннем
Усмешкі расквечвайце іх.

Не золата й срэбра дарыце,
А тое, чаго не купіць:
Расінку крыштальную ў жыце,
Святлісты разліў зараніц.

Узрушанай жаўры пяшчоту,
Крынічных лугоў дабрыню,
І звонкіх вясёлак ясноту,
І белых садоў чысціню.

Дарыце, дарыце каханым
Празрыстае сэрца — да зор.
Хай шчасцем высокім, жаданым
Квітнеюць душа і прастор.

Фота з архіва М. Пазнякова

ЗМІТРОК МАРОЗАЎ

Урокі сялянскай акадэміі

З рабочых дзённікаў маладога агранома

Марозаў Змітрок (Дзмітрый) нарадзіўся 2 студзеня 1954 года ў пасёлку Язбы Крупскага раёна Мінскай вобласці. Паэт, празаік, публіцыст. Скончыў аграномічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Працаваў аграномам у калгасах на Магілёўшчыне. Пэўны час быў на камсамольскай рабоце. Больш за 20 гадоў — на розных пасадах у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і ў Міністэрстве гандлю Рэспублікі Беларусь. Аўтар 30 кніг паэзіі і прозы для дарослых і дзяцей: «Пад небам бусліным», «Хлеб і памяць», «Сын чалавечы», «Святло рамонкаў палявых», «Мне Богам дадзена Радзіма», «Гронкі зорных суквецця ў», «Акварэлі пачуцця», «Вяртанне да цішыні», «Вачыма сэрца», «Храм», «І жаўранка накцюрн у паднябессі...», «Азбука аграномa валошкі», «І скажуць унукі» і інш. Выдаў першы ў славянскай паэзіі вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы», які вытрымаў шэсць перавыданняў, у тым ліку ў перакладзе А. Цяўлоўскага на рускую мову (2006, 2015). Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, двойчы лаўрэат рэспубліканскіх конкурсаў за лепшую кнігу года, прэміі «Залаты Купідон», лаўрэат міжнароднага конкурсу «Семья. Единение. Отечество».

Замест уступу

Працуючы аграномам у калгасах на Магілёўшчыне, я вёў рабочы дзённік. Мае асабістыя назіранні і ўражанні ляглі ў аснову дакументальнай аповесці «Урокі сялянскай акадэміі». Рыхтуючы дзённікавыя запісы да друку, я імкнуўся падкрэсліць галоўнае: прафесійнае і маральнае станаўленне маладога спецыяліста — рэч даволі складаная. Вялікая роля ў гэтай справе належыць сціплым вясковым працаўнікам. Вось чаму першы год у калгасе «Зарэчны» для галоўнага героя аповесці — маладога аграномa Алеся Валошкі — своеасаблівы шосты курс сялянскай акадэміі.

Шмат перашкод і цяжкасцей сустракае ён на сваім шляху. Але дзякуючы падтрымцы, чалавечай цеплыні і чуласці вясковых працаўнікоў Алесь Валошка становіцца добрым спецыялістам, загартоўвае свой характар у барацьбе з казёншчынай і бюракратызмам, бяздумным адміністраваннем, з усім тым, што і сёння замінае сацыяльна-эканамічнаму і духоўнаму адраджэнню вёскі і вясковага чалавека.

Дзённік пісаўся ў 1986—1987 гадах, мо нешта ў ім ужо страціла сваю надзённасць, але ў аповесці я пакідаю ўсё так, як было напісана,— гэта маё дакументальнае сведчанне: якой была наша вёска напрыканцы васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. У той час праблемы былі пераважна гаспадарчыя, у рэчышчы камандnага гаспадарання, і на тым фоне выразней паўстаюць праблемы сучаснай вёскі — праблемы не толькі сацыяльна-эканамічныя, але і палітычныя, без перабольшвання — гістарычныя.

Прыезд у «Зарэчны»

З райцэнтра да «Зарэчнага» на сваім старэнькім уазіку мяне падкінуў галоўны аграном упраўлення сельгаспадаркі райвыканкама Дабрынін. Надвор'е было кепскае. Над палямі вісела абложная імжака. Па дарозе Дабрынін распавёў мне пра дасягненні калгаса, які лічыўся моцным серадняком у раёне.

У новым будынку праўлення нас ужо чакаў кіраўнік гаспадаркі — высокі, плячысты мужчына з валявым, нібы высечаным з граніту, тварам, з густым налётам сівізны ў чорных, як смоль, кучаравых валасах на галаве і на скронях. На выгляд чалавеку было не больш за сорак гадоў.

Калі мы зайшлі ў кабінет, старшыня калгаса энергічна ўзняўся з крэсла і з шырокай добрай усмешкай, якая заўсёды бывае ў людзей дужых, упэўненых у сваіх сілах, зрабіў тры крокі нам насустрач. Працягнуў шырокую, як вясло, далонь спачатку Дабрыніну, а потым і мне.

— Шахавец Іван Пятровіч, старшыня калгаса,— ён моцна паціснуў маю руку.

— Валошка Алесь,— не зусім упэўнена вымавіў я, саромеючыся назваць сваё імя па бацьку.

Але, здаецца, старшыня не звярнуў на гэта ніякай увагі.

— Нарэшце, дачакаўся! А то да жніва засталіся лічаныя дні, а без аграномa, самі ведаеце... Дзякуй, Пракопавіч, выручыў! — як лепшага сябра, Шахавец ляпае па плячы Дабрыніна. Пры гэтым ягоныя цыганскія вочы свецяцца непадробнай, амаль дзіцячай радасцю.

— Ты, братка, не мне дзякуй, а Валошку,— з усмешкай адмахваецца ад старшыні галоўны аграном раёна.— З пяці вакансій упадабаў чамусь твой калгас. Тым не менш сваё я зрабіў, а цяпер твая чарга. І глядзі мне!.. Асабліва мальца не крыўдзі! А то я ведаю твае замашкі...

Пры гэтым невысокі, драбнаваты Дабрынін, на вачах пасур'ёзнеўшы, махае пальцам каля масіўнага баксёрскага падбародка асілка-старшыні. У адказ той, робячы выгляд невіноўнага ягняці, прыціскае рукі да грудзей і адно паўтарае:

— Не турбуйся, Пракопавіч, усё будзе добра. Хіба я першы год замужам?

Я пазіраю на гэтую камічную сцэнку і ледзь стрымліваю ў сабе смех.

— Ну вось і пазнаёміліся,— гаворыць задаволена Дабрынін,—пагаманіў бы з вамі яшчэ, ды толькі часу — кот наплакаў. Першы райкама сёння праводзіць нараду па жніве. Так што выбачайце.

Развітваючыся, ён на нейкі час затрымлівае маю далонь у сваёй руцэ, свідруе мяне жывымі вачамі-бураўчыкамі, гаворыць:

— Ну што ж, поспехаў табе, аграном.

Мы засталіся адны. Хвіліну-другую ў кабінеце — такая нязвыклая цішыня, што чуваць, як за акном шамаціць цёплы ліпеньскі дождж-грыбасей. Няёмкае маўчанне парушае Шахавец:

— А ты, Алесь, выпадкова не жанаты?

— Быў такі выпадак — хутка год міне. Жонка праз два месяцы заканчвае кулінарнае вучылішча...

— Кулінарнае, кажаш? — зацікаўлена перапытвае старшыня.— Што ж, густ у цябе, аграном, бачу, ёсць — што-што, а галодным хадзіць не будзеш. Праўда, у калгасе сталоўкі няма. Ды ты асабліва не бядуй, знойдзем для тваёй ненагляднай занятак. Нам даяркі да зарэзу патрэбны. То ж дажыліся: у Барку на ферме жанкі па чарзе кароў дояць.— Шахавец хітравата жмурыцца, нібы выпрабоўвае мяне: як я адрэагую на такую вось перспектыву для маёй Таццяны?

— У рабоце для жонкі пакуль пільнай патрэбы няма,— я раблю выгляд, што не прыкмеціў хітрасць Шахаўца. І ўдакладняю: — Яе размеркаванне — у раддом.

— Як гэта ў раддом? — перапытвае мяне старшыня.

— Ды нараджаць ёй час.

— А-а-а... Гэта добра! У наступным годзе дзіцячы садок закладзём. Так што ты асабліва не хвалюйся. Знойдзецца тваёй кабеце работа — дзяцей даглядаць будзе. Аднойчы я падлічыў, што ў калгасе дванаццаць маладзіц не могуць адарваць немаўлят ад цыцкі. Сядзяць дома, пакуль дзеці крыху падрастуць. А для гаспадаркі

гэта прамыя страты, бо губляем самыя маладыя і дужыя рукі.

Старшыня ўздыхае і раптам, пляснуўшы даланёй па стале, раздражнёна гаворыць:

— Маючы штогод ледзь не мільён прыбытку, даўно можна было б пабудаваць дзіцячы сад. Ды толькі ўся нявыкрутка ў тым, хлопча, што не я распараджаюся сваім мільёнам, а раён.

— Як гэта раён? Калгас — гаспадар і грошы ягоныя! — мне хочацца як мага хутчэй дайсці да галоўнага, зразумець сутнасць пытання.

— Э-э-э,— не хаваючы здзіўлення, гаворыць Шахавец.— Бачу, ты, хлопча, зусім яшчэ зялёны. У акадэміі пяць гадоў пра гэта вам лекцый, канечне, не чыталі. А трэба было б і растлумачыць, як старшыня-мільянер носіцца з мехам грошай па розных інстанцыях з адным маленнем: «Прадайце — заплачу колькі трэба». А яму на гэта: «А дзе мы табе возьмем той цэмент, цэглу, трактары, машыны, калі іх не толькі не хапае для раёна, але і для цэлай вобласці? Ды і ў рэспубліцы з забеспячэннем гаспадарак не ўсё вырашана. Газеты чытаеш? Радыё слухаеш? Ведаеш? Калі ведаеш, дык ідзі і працуй. Нечага парогі кабінетаў абіваць».

Старшыня дастае з пачка «беламорыну», нервова пстрыкае запальнічкай, прагна зацягваецца і разам з кольцамі дыму выдыхае пытанне:

— Ну як, братка, уцяміў хоць што-небудзь?

— Напэўна, гораду будаўнічыя матэрыялы больш патрэбныя? — не зусім упэўнена мяркую я.

— Во-во, бачу, што галава ў цябе варыць. Паглядзі, колькі новых мікрараёнаў за апошнія гады выросла ў адным толькі Магілёве! А будоўля заводаў і фабрык, атамных станцый, мастоў і дарог? Гэтага, дарагі мой аграном, нельга скідваць з гаспадарчага рахунку краіны. Напэўна, гораду цэмент, асфальт і цэгла пакуль больш патрэбныя, чым драўлянай вёсцы. Па маіх падліках атрымліваецца так: калі б мы за гэтую пяцігоду здавалі штогод па пяць кватэр і пабудавалі дзіцячы сад, то не стаяла б сёння перад намі гэтак востра праблема кадраў у жывёлагадоўлі, ды і механізатары маладыя асядалі б у родных мясцінах, а не гналіся за гарадскім пералікам. Адпаведна, і ў горадзе знялі ся б шмат якія праблемы, звязаныя з міграцыяй вясковай моладзі з такіх гаспадарак, як наша. А іх, дарэчы, многія сотні ў рэспубліцы.

Старшыня расцірае недакурак на пепельніцы і працягвае свой аповед:

— Ну што, адкрыў я, Валошка, для цябе закон калгаснай дыялектыкі? Куды моладзь — туды і грошы. Вось я ў калгасе працую дваццаты год і зведаў гэта на ўласнай скуры. Прыняў гаспадарку ў лістападзе шэсцьдзясят пятага года. Можна сказаць, ляжачай. У банку мільён з хвосцікам крэдытаў. Дысцыпліны аніякай: людзі распіліся зусім, тэхніка запушчана, дабітая да ручкі, фермы трухлявыя — наляціць добры віхор — пахавае пад сабой жывёлу. Надой малака на карову не перавышае надою ад казы. Агратэхніка на палях — узровень прадзедаўскай сахі, ураджай збожжа на круг дарэвалюцыйны — трынаццаць цэнтнераў. Скажу табе па праўдзе, не было ў мяне ахвоты ісці на гэтую пасаду. Было мне тады дваццаць тры гады, працаваў галоўным інжынерам у суседняй гаспадарцы. Справу сваю ведаў, а пра больш высокія пасады нават і не марыў.

Шахавец дастае з пачка новую «беламорыну» і зноў закурвае. Нетаропка адганяе ад сябе шырокай даланёй воблачка дыму.

— М-да! Я не марыў і не думаў, затое за мяне думалі. Паклікаў неяк да сябе сакратар райкама партыі Валасавец. Пасадзіў у крэсла насупраць і без усялякай там папярэдняй падрыхтоўкі паставіў пытанне рубам: «Пасля сакавіцкага пленума партыі мінуў час. Па ўсёй краіне — патрыятычны ўздым. А ў «Зарэчным», як у балоце, бурбалкі гуляюць ды п'яніцы валяюцца. Чалавек ты хоць і малады, але сякі-такі вопыт работы з людзьмі маеш. Карацей кажучы, ідзі і падымай гаспадарку на ногі. А мы, калі што, дапаможам». Выкручвацца я не стаў, бо адчуў, што ў гэтай сітуацыі мая натурыстасць можа вылезці бокам. Перад

тым адзін малады аграном спрабаваў аднекнуцца: маўляў, зялёны яшчэ, куды мне ў кіраўнікі? І што ж думаеш? Па галоўцы пагладзілі за шчырае прызнанне, дзякуй сказалі? Ага, чакай! Выйшаў ён з райкама без партбілета. Мог бы атрымаць пасаду, а страціў тую, што меў. Словам, трапіў я ў «Зарэчны», як певень у капусту. Прыехаў туды са сваёй Кацярынай (незадоўга да майго прызначэння з ёй вяселле згулялі). Яна мяне і падтрымлівала, падбадзёрвала ў той цяжкі час.

Старшыня лагаднее. Вочы і твар свецяцца нейкім незвычайным чалавечым цяплом.

— Не ведаю чаму, але менавіта з таго пераломнага для мяне часу я пачаў называць сваю Кацярыну — «золатца маё». У астатнім жа быў я голы як сакол. Толькі адна пячатка ў руках. А за тыя крэдыты ўсю гаспадарку можна было прадаць з малатка разам з яе старшынёй. Карацей кажучы, мае папярэднікі дабілі калгас да ручкі, а мне — расхлёбвай кашу.

За размовай Шахавец непрыкметна дакурыў другую «беламорыну» і зноў пацягнуўся да пачка з папіросамі.

— Можа, не трэба, Іван Пятровіч, га? Вельмі ж многа вы курыце,— спрабую стрымаць старшыню.

Але той робіць сваё і, не звяртаючы ўвагі на маю просьбу, апавядае далей:

— Нічога, аграном, паспытаеш печанага рака — і сам закурыш. Дык гэта, на чым я спыніўся?

— Ды на папярэднікаx.

— Ага! Дык вось што я думаю. Не магу сказаць, што ўсе яны былі бяздарнымі кіраўнікамі і марнатраўцамі. Не! Пасля вайны гадоў з дванаццаць кіраваў тут Міхайла Талан. Былы франтавік, адукацыя — тры класы з чацвёртым калідорам, але быў моцны кіраўнік, з народам умеў ладзіць. Яго і сёння старыя людзі добрым словам успамінаюць. Пры ім «Зарэчны» выйшаў у лік першых у раёне. Калі Талан памёр, жонка ягоная расказвала: «Як звычайна, правёў Міхась планёрку. Пасля прыехаў дахаты на сняданак. Але не сеў, як звычайна, за стол, а прылёг на канапу. І ціха аддаў Богу душу». З сэрцам, даражэнькі мой, жартачкі кепскія. Здараецца, гэтак прыцісне, што ні дыхнуць, ні выдыхнуць, толькі, як той балотны карась, хапаеш ротам паветра, а думкамі ўжо гасцюеш на святых нябёсах.

— Дык і ў вас сэрца?

— А як жа? Усе старшыні майго прызыву — безнадзейныя сардэчнікі. Праўда, іх у раёне на сённяшні дзень засталося толькі тры: я, мой даўні сябра Пятро Багун з суседняй «Зоркі» ды Паліна Маўрына з «Прагрэсу». Гэта толькі злыя языкі і журналісты любяць расказваць небыліцы і анекдоты пра нашу каменную бессардэчнасць і жалезны характар.

Старшыня змаўкае і заклапочана глядзіць у акно. Сярод абцяжараных нудным дажджом хмарачосаў з'явіліся светлыя прагалы.

— Аднак заседзеліся мы тут,— гаворыць Шахавец і першы падымаецца з крэсла.— Пойдзем, падкіну цябе да Сібіркі. Пакуль што будзеш кватараваць у яе. Прыедзе жонка — дам вам пустую кватэру былога агранома ў двухпавярховым катэджы, балазе, ад яго да калгаснай канторы рукой падаць.

У той жа дзень пасля абеду

Шахавец пазнаёміў мяне з Сібіркай — з выгляду цельпукаватай, але даволі жвавай, гаманкой бабуляй. Коратка расказаў ёй, хто я, адкуль, кім буду рабіць у калгасе, і паспяшаўся з хаты. Ужо на парозе кінуў:

— Можаш адпачываць, аграном. Глядзі не праспі, заўтра ў шэсць гадзін раніцы — планёрка.

Я крыху перакусіў з дарогі, нейкі час пагаварыў з Сібіркай. Ды пад канец размовы стала сумнавата, і я выйшаў на вуліцу. Адразу за гародамі знаходзіліся калгасны мехдвор, гараж і майстэрня, туды я і падаўся.

Яшчэ здалёк убачыў ладную постаць Шахаўца і купку механізатараў, якія завіхаліся каля сянажнага комплексу КСК-100.

— Што, аграном, не сядзіцца табе ў Сібірчынай хаце? — запытаў старшыня.

ІВАН КАПЫЛОВІЧ

Абранай дарогай ідуць

Вершы

Капыловіч Іван нарадзіўся 2 лютага 1944 года ў вёсцы Забалацце Мазырскага раёна. Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Служыў у Савецкай арміі. Працаваў у газеце «Чырвоная змена». У адной з камандзіровак трапіў у аўтамабільную катастрофу, доўгі час быў прыкуты да бальнічнага ложка. Друкаваўся ў тыднёвіку «ЛіМ», часопісах «Полымя», «Маладосць», «Нёман». Аўтар кніг прозы «Сонца садзіцца ў травы», «Два дні ў лютым», «Асенні гром», «Сны не вяртаюцца», «Імянны гадзіннік», «Пасынак», «Крумкач», «Лісты з далёкай чужыны», «Калі трэба жыць», «Ураган», «Правінцыялка» і інш.

Буду я спавядацца ці раз —
Хай душу маю вера сілкуе.
Без той веры ў часіну ліхую
Ў адначассе я згінуў бы, згас.

Я фантазіяй цешу сябе —
Цешу тым, што жыве ў думцы-мроі.
Жорсткі час усе планы пакроіць:
Застануся я ў смутку-жальбе.

Застануся ў сапраўднасці той,
У якой сваю вызначу сутнасць:
У дарадцы паклічу я мужнасць,
Асуджу нерашучы настрой.

Не знайду апраўдання таму,
Што рабіў я нікчэмнасці ўступкі:
Як даваліся цяжка прыступкі,
Па якіх мне ісці аднаму.

Заімшэлы камень прыдарожны,
У якія ж гэта ён вякі
Паваліўся на дыван мурожны,
За жыццё трымаецца як можна
І глядзіць, глядзіць ва ўсе бакі?

Добра бачная яму дарога,
Што не сціхне нават і ўначы.
З веку разагналася якога,
Склала каляндар без выхаднога —
Не збіраецца ісці на адпачын.

Расказаў бы камень вельмі многа,
Распытаў бы калі хто яго.
Ўдосталь бачыў добрага, ліхога,
Што ад веку слыннага, сівога —
Гэты час парослы быльнягом.

Час яго не скончыцца ніколі —
Валуновы гэткі круты лёс.

ПЕРАКЛАДЫ

Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны
ўніверсітэт

ЛУ СІНЬ



Фота з інтэрнэт-крыніц

Лу Сінь (сапраўднае імя Чжоў Шужэнь) нарадзіўся ў 1881 годзе ў правінцыі Чжэцзян на ўсходзе Кітая ў вельмі адукаваных бацькоў. Скончыў ваенна-марскую акадэмію і горна-чыгуначнае вучылішча, дзе ўпершыню пазнаёміўся з заходнімі мовамі і літаратурамі, а пасля, нагледзеўшыся на хранічны туберкулёз і заўчасную смерць бацькі, вырашыў вучыцца на лекара. Унікаючы традыцыйнай медыцыны, веры ў якую яго паззбавілі шарлатаны, што ўвесь час кружылі вакол хворага бацькі, але так і не дапамаглі яму, будучы аўтар паступіў у Сэндайскую медычную акадэмію ў Японіі, дзе выкладалі па еўрапейскім узоры. Але кінуў яе.

Аднойчы студэнтаў затрымалі пасля заняткаў, каб паказаць зробленыя ў Маньчжурыі фотаздымкі з руска-японскай вайны. На іх некалькі японскіх салдатаў каралі смерцю кітайцаў, абвінавачаных у дапамозе Расіі. На фотаздымак трапілі і кітайцы-назіральнікі, сапраўдны натоўп, нібыта абыякавы да таго, што адбываецца, цалкам бяздзейны. Паглядзеўшы на іх, Лу Сінь прыйшоў да высновы, што лячыць душу кітайскага народа больш значна, чым цела.

Пасля былі спробы трапіць у нямецкі інстытут у Токіа, заняткі рускай мовай, змушанае маці вяртанне ў Кітай, шлюб па дамоўленасці, праца настаўнікам, вяртанне ў Японію, намаганні выдаваць часопіс і кнігу перакладаў, расчараванне і алкагалізм, пасада ў Міністэрстве адукацыі новаўтворанай Кітайскай Рэспублікі, прыхільнасць да левых ідэй, нарэшце, публікацыя ў 1918 годзе «Дзенніка вар'ята», дзе крытыкавалася тое застарэлае ў ментальнасці кітайцаў, што душыць іх.

Лу Сінь нарадзіўся ў Кітаі, дзе ўсе мастацкія і навуковыя тэксты ствараліся на вэньянь, класічнай кітайскай мове, застылай у трэцім стагоддзі нашай эры, назаўсёды адарванай ад жывой штодзённай кітайскай мовы; на вэньянь, незразумелай без мэтанакіраванага вывучэння і, адпаведна, даступнай толькі маленькай частцы кітайцаў. Лу Сінь быў сярод пачынальнікаў ідэі аб тым, каб нарэшце пакінуць вэньянь у мінулым і аддаць усе яе ролі байхуа – пісьмоваму варыянту народнай мовы. «Дзённік вар'ята» адкрываецца невялічкай прадмовай на вэньянь, дзе безыменны апавядальнік тлумачыць, як натрапіў на дзённік. Сам жа дзённік падаецца цалкам на байхуа. Так гэтае апавяданне стала першым тэкстам той кітайскай літаратуры, якую мы называем сучаснай. Так Лу Сінь стварыў Кітай, дзе прыгожае пісьменства ўжо не належыць адным чыноўнікам.

У жыцці Лу Сіня, якое скончылася ў 1936 годзе не ў апошнюю чаргу праз усё той жа хранічны туберкулёз, было яшчэ шмат светлага і цёмнага: 10 гадоў выкладчыцкай працы ў розных кітайскіх універсітэтах, намінацыя на Нобелеўскую прэмію, новыя расчараванні, адмова ад выкладання, адмова ад літаратуры. Але значна тое, што да канца жыцця ён не адмовіўся ад народжанага ў студэнцкія гады стваральнага нацыяналізму, глебай якога была вера, што шчасце Кітая не ў мінулым, а ў будучыні.

Кірыл Булай

Дзённік вар'ята

Браты, чые імёны я тут апускаю, былі ў школе маімі добрымі сябрамі. Я развітаўся з імі на доўгія гады, і з цягам часу весткі ад іх перапыніліся. Гэтымі днямі выпадкова пачуў, што адзін з іх цяжка хварэе. На шляху ў родныя мясціны я збочыў, каб наведаць братоў, але знайшоў там толькі старэйшага. Ён сказаў мне, што хворы — малодшы.

«Дарма вы, пане, пераадолелі такую даўгую дарогу. Ён даўно паправіўся і адбыў шукаць, дзе б знайшлася яму вольная пасада».

Тады ён засмяяўся, дастаў два сшыткі дзённіка, працягнуў мне і сказаў, што не здарыцца нічога страшнага, калі даўні сябар даведаецца, што адбывалася з яго братам падчас той хваробы. Прачытаўшы дзённік, я зразумеў, што хворы пакутаваў ад так званай маніі праследавання. Запісы яго бязладныя, а месцамі не маюць сэнсу ўвогуле. Нідзе не адзначаныя ні дзень, ні месяц, і толькі па неаднолькавасці почырку ды колеру тушы можна меркаваць, што дзённік той быў напісаны не за адзін раз. Але паміж асобнымі часткамі ўсё ж можна знайсці сувязь. Сабраныя разам, іх я перадаю для даследавання дактарам. Я не змяніў ні слова, акрамя імёнаў, што не мае аніякага значэння, бо людзі тыя ўсе вясковыя і мала хто іх знае. Што датычыцца назвы кнігі, то яна была дана аўтарам дзённіка пасля яго выздараўлення і мной не мянялася.

2-гі дзень 4-га месяца 7-га года

Дзень першы

Які ж прыгожы сёння месяц!

Я не бачыў яго ззяння трыццаць гадоў, а сёння ўбачыў, таму і душа радуецца.

Трыццаць гадоў я пражыў у дурмане, але цяпер нарэшце ўсё, усё разумею. Аднак трэба сцерагчыся. Не проста ж так суседскі сабака на мяне вылупіўся?

Я баюся нездарма.

Дзень другі

Сёння ніякага месяца, быць бядзе. Калі я выбраўся зранку на вуліцу, Джаа Гуйвэнь неяк дзіўна на мяне пакасіўся, нібы думаў учыніць шкоду, а я яго спудзіў. Яшчэ сем-восем чалавек шапталіся, перамывалі мне косткі, але ўсе як адзін пазбягалі майго позірку. Кожны, хто сустракаўся мне на дарозе, быў такі, толькі адзін, самы ліхі, усміхнуўся, ашчэрыў свае зубы. Мяне з ног да галавы абдало холадам, калі зразумеў: яны ўсе заадно.

Я не выкрыў свайго страху, пайшоў як ішоў. Але далей натрапіў на зграю дзяцей. Яны таксама шапталіся. Іх вочы былі адно што ў Джаа Гуйвэня, а твары белыя, нібы ў нябожчыкаў. Якое зло я зрабіў тым дзецям, што яны са мной так? Не стрымаўся і крыкнуў: «Чаму, га?! Адкажыце мне!» Яны адразу збеглі.

Узяўся ўспамінаць. Чым я мог пакрыўдзіць Джаа Гуйвэня? А тых, на дарозе? Калі гадоў дваццаць таму папсаваў старую рахунковую кнігу спадара Гу Дзю, ён страшна абураўся. Джаа Гуйвэнь ніколі не ведаў таго Гу Дзю, але ж нехта, напэўна, данёс, і ён прасякнуўся чужым болем. Туды ж і людзі на дарозе — мая віна. А з дзецьмі што? Яны тады і не нарадзіліся яшчэ, дык чаго ім цяпер пырыць вочы? Яны нібыта баяцца мяне, нібы жадаюць мне зла. Гэта палохае, дзівіць і маркоціць.

Я зразумеў. Іх панавушчалі іх маткі!

Дзень трэці

Ноччу так і не атрымалася заснуць. Пакуль я не разбяруся з гэтай справай, яна мяне не адпусціць.

Яны... Сярод іх ёсць тыя, хто закоўваў у кайданы ўладароў, хто лупіў паноў, чыіх жонак гвалцілі паліцыянты, чыіх бацькоў даводзілі да смерці ліхвяры, але ніколі раней іх твары не былі такімі страшнымі, такімі лютымі.

Самым дзіўным за ўчора быў наступны выпадак. Жанчына ўдарыла свайго сына і крыкнула: «Ды я цябе зараз загрызу!» Але яго вочы тым часам глядзелі толькі на мяне. Я так напалохаўся, што не здолеў

гэтага схаваць. Іклатыя морды навокал зарагаталі. Чэнь Лаову адразу падхапіў мяне і пацягнуў дахаты.

Дома сваякі ўсе адначасова прыкінуліся, што не знаюць мяне, іх твары зрабіліся такімі ж, як у іншых. Я забег у кабінет і пачуў, што мяне замкнулі на ключ, як замыкаюць курэй ці качак. Чым болей ведаю, тым меней разумею.

Пару дзён таму селянін з суседняй вёскі прывёз майму брату страшную навіну. Некалькі ягоных аднавяскоўцаў раскапалі труп ліхадзея, які раней забіў свайго гаспадара, выразалі яму сэрца і печань, засмажылі іх ды з'елі, каб набыць мужнасць. Я ўставіў слова, і селянін з братам адначасова ўперылі ў мяне вочы. Цяпер мне ясна, што іх погляды такія ж, як у тых, што звонку.

Памятаю, якім холадам мяне абдало.

Яны ядуць людзей і наўрад ці стрымаюцца ад таго, каб з'есці і мяне.

Глядзі: пагроза жанчыны, рогат мордаў, заўчарашні аповед селяніна — гэта ўсё яўныя знакі. Я ўсё бачу. Іх словы — яд, іх смех — нож. Іх вострыя белыя зубы могуць быць толькі зубамі людаедаў.

Я, на ўласную думку, ніякі не злачынец, але праз выпадак з рахунковай кнігай у некаторых мог узнікнуць сумнеў. Яны нешта задумалі, а што — я ўсё ніяк не магу разгадаць. У іх чалавек, як толькі дзе аступіцца,— адразу злачынец. Памятаю, як брат навучаў мяне, што добры чалавек, калі пачаць з ім спрачацца, абавязкова будзе біцца за сваю праўду, а благі, наадварот, паступіцца ёй, пачне ліслівіць, дзей, «вы заўсёды маеце рацыю, не тое што іншыя». Немагчыма зразумець іх намеры. Асабліва калі размова ідзе пра людаедства.

Калі гэтую справу не расследаваць, ніякай яснасці не дачакаешся. Вядома, людзі елі адзін аднаго спрадвеку. Узяў пагартаць кнігу па адносна нядаўняй гісторыі. На кожнай старонцы то тут, то там «справядлівасць», «цнота». Я ніяк не мог заснуць, то паўночы вывучаў. Прыглядзеўся, а там паміж радкоў дробненька — «людаедства».

У кнізе шмат слоў, і людзі кажуць шмат слоў, і кожны хіхікае, гледзячы на мяне.

Я таксама чалавек. За адно гэтае яны хочуць мяне з'есці!

Дзень чацвёрты

Раніцай я пэўны час медытаваў. Пасля Чэнь Лаову прынёс мне паесці: міску гародніны і міску рыбы на пары. Рыбіны вочы белыя і цвёрдыя, а рот адкрыты, як рот людаеда ў прадчуванні. Я не мог быць упэўнены, што мне пад выглядам рыбы не падсоўваюць чалавечыну, таму толькі трошкі пасмактаў і выплюнуў.

Тады я папрасіў: «Лаову, перадай майму брату, што я занудзіўся і хацеў бы прайсціся па садзе». Ён нічога не адказаў, так моўчкі і выйшаў. А праз некаторы час вярнуўся і адчыніў дзверы.

Я не варухнуўся, вырашыў пачакаць, паглядзець, што яны думаюць са мной рабіць. Побач з імі нельга губляць галаву.

І праўда! Брат прывёў нейкага дзеда, той павольна падышоў да мяне. Вочы ў яго былі вельмі нядобрыя, і ён, каб я гэтага не заўважыў, нахіліў галаву і паглядзеў на мяне праз аправу акуляраў. Мой брат прамовіў: «Сёння ты выглядаеш нармальным». На што я адказаў: «А так і ёсць». Брат кажа: «Гэта спадар Хэ, ён хоча агледзець цябе». А я: «Чаму не». А я ж ведаю, што дзед гэты — пераапрануты кат! Сказаў «мераць пульс», а на самай справе будзе ацэньваць маю ўкормленасць. Яму за тое мо і кавалак мяса абяцаны.

Я не баюся. Я чалавечыны хоць і не еў, а ўсё ж смялейшы за іх. Я выцягнуў руку, сціснуў кулак і стаў назіраць, што ён будзе рабіць. Ён трохі памацаў, трохі пастаяў, а пасля расплюшчыў свае д'ябальскія вочы і сказаў: «Не турбуйцеся. Проста дайце яму адпачыць некалькі дзён, і ўсё пройдзе».

Не турбуйцеся, дайце адпачыць. Як жа! Я адпачну, ад'емся, і вам будзе болей мяса. А мне якая карысць? Ну, людаеды, хочуць і чалавека з'есці, і сваю сутнасць не выкрыць, вось і марудзяць. Такая з імі пацеха! Я не вытрымаў, тут жа і зарагатаў ва ўвесь голас. У маім смеху было колькі хочаш мужнасці, дзед з братам ажно збялелі, агаломшаныя ёю.

За яе яны мяне і хочуць з'есці, спадзяюцца пераняць хоць трошкі. Дзед выйшаў за дзверы, зрабіў колькі крокаў і шапнуў майму брату: «Нельга губляць час». А брат

кіўнуў. І ты з імі! Гэтае значнае адкрыццё хоць і выглядае звычайным супадзеннем, але, па сутнасці, не з'яўляецца нечым нечаканым. Мой брат у змове з людаедамі.

Мой брат — людаед!

Я брат людаеда!

Мяне з'ядуць, але я назаўсёды застануся братам людаеда!

Дзень пяты

Я вось падумаў: калі б той дзед насамрэч быў лекарам, а не пераапранутым катам, ён усё адно быў бы людаедам. Настаўнік Лі Шыджэнь у сваім «Нешта там лекавых рэчываў» у дробязях апісваў, як гатаваць і есці чалавечыну, дык што вы думаеце, ён сам ані разу не спрабаваў?

Што датычыцца майго брата, яго я дакладна нічым не пакрыўдзіў. Ён, калі неяк тлумачыў мне адну кнігу, сам казаў, што можна «абмяняцца дзецьмі і з'есці іх»[1]. А аднойчы лаяў нейкага злыдня, усяляка-га нагаварыў. Ладна, што пазычыў смерці, дык сказаў, што сніць «наесціся яго мяса ды паспаць на яго скуры»[2]. Я тады яшчэ малы быў, то мяне ажно паўдня трэсла. А калі пазаўчора той селянін расказваў пра зверствы сваіх аднавяскоўцаў, брат нават не здзіўляўся, толькі ківаў галавой. Відавочна, былая ж яго лютасць нікуды не знікла. Калі можна «абмяняцца дзецьмі і з'есці іх», то каго з'есці нельга? Дурноты ў яго навуцы я заўважаў і раней, але толькі цяпер бачу, што і на вуснах яго спяклася чалавечая кроў, і ў сэрцы — прага новых ахвяр.

Дзень шосты

Цёмна — хоць вока выкалі. Не разумею, ці дзень, ці ноч. Суседскі сабака зноў брэша.

Ільвіная бязлітаснасць, заячая базлівасць, лісіная хітрасць...

Дзень сёмы

Ну ўсё, цяпер ясна, што са мной будзе. Мяне задумалі знішчыць так, каб не запэцкаць рукі. Адступаць яны не хочуць, але вагаюцца, бо баяцца, што я ім пасля смерці буду помсціць. Вось і змовіліся, расставілі пасткі, а ўсё, каб давесці мяне да самазабойства. Паглядзіце на добрых людзей нашага мястэчка, паразважайце над апошнімі ўчынкамі майго брата, і вам на думку адразу прыйдзе спосабаў восем-дзевяць. Лепш за ўсё — зняць пояс, зачапіць яго пад столлю ды на ім павесіцца. Так ніхто не зможа абвінаваціць іх у забойстве, жаданне будзе споўненае, і ўсе атрымаюць найвялікшую асалоду, стануць булькатаць, скавытаць, рагатаць. А памры я ад нуды ці страху, атрымаўся б ужо хударлявы, хай і таксама нішто сабе.

Яны ядуць адну мярцвячыну! Памятаю, чытаў пра пачвару, якую называюць «гіенай». Што вочы, што морда ў яе брыдкія, жарэ адну падлу, ператрушчвае і глытае нават косці. Памятаю яшчэ, што баіцца людзей. Гіена — радня воўку, а воўк — сваяк сабакі. Ай, не проста так на мяне пазаўчора вылупіўся суседскі сабака! Канешне, і ён у змове. Дзед апускае вочы, але ад мяне іх схаваць не можа.

Больш за ўсё шкада брата. Ён жа таксама чалавек, дык чаму не баіцца з'есці падобнага сабе? Дзікунскі звычай? Ці ён да такой ступені страціў сумленне, што наўмысна ідзе на злачынства?

Я праклінаю канібалаў, усіх, і яго ў першую чаргу. Я пераканаю іх, пачну з брата.

Дзень восьмы

Насамрэч, яны і самі мусілі даўно ўжо зразумець, што...

Раптам зайшоў хлопец год дваццаці. З выгляду мутны, нават не магу апісаць. Як убачыў мяне, твар ажно заззяў усмешкай. Пакланіўся, а я гляджу — усмешка ў яго зусім не шчырая. Я адразу спытаў:

— Наконт канібалізму, так?

Ён, дагэтуль шчэрачыся, кажа:

— Год хлебны, навошта есці людзей?

---

[1] Так нейкі Хуа Юань пісаў пра голад у асаджаным горадзе.

[2] Вобразны выраз у кітайскай мове, які мае значэнне «марыць аб знішчэнні кроўнага ворага».

Да 100-годдзя

ВАСІЛЯ БЫКАВА



Мікола Курыпка

Васіль Быкаў на глобусе мастацкіх перакладаў

Пачынаючы з сярэдзіны XX ст. тэма Другой сусветнай вайны была адной з асноўных у нацыянальных літаратурах краін-удзельніц гэтага ваеннага канфлікту. Па сваім эмацыянальна-псіхалагічным напаўненні ўплыў крывавай вайны на гісторыю чалавецтва, яго грамадскую свядомасць і мастацкае асэнсаванне падзей быў значна большы, чым за ўсе мінулыя войны разам узятыя. Другая сусветная вайна была ўдарам па гуманізме, культуры і ўсім, што было створана чалавекам за мінулыя стагоддзі. Адзін з найбольш таленавітых паслядоўнікаў ваеннай тэмы В. Быкаў некалі справядліва сказаў аб невычэрпнасці падобнай літаратуры: «Колькі ўжо напісана пра вайну на многіх мовах свету, але нягледзячы на тое, што пісаць становіцца ўсё цяжэй, з'яўляюцца ўсё новыя творы, што часам радуюць, а часам і ўражваюць чытача сваёй праўдай і глыбінёй. І тут няма межаў, магчымасці гэтай тэмы бясконцыя»[1].

Беларуская ваенная проза бясспорна з'яўляецца часткай адной агульначалавечай спадчыны — антыфашысцкай і антываеннай літаратуры. Ужо не першае дзесяцігоддзе беларуская літаратура развіваецца ў рэчышчы агульнаэстэтычнай накіраванасці з іншымі сусветнымі літаратурамі, у заканамернасці з сусветным літаратурным працэсам. І ў дадзеным кантэксце фігура В. Быкава займае, магчыма, ключавое месца па сваім уплыве на папулярызацыю беларускай мастацкай думкі ва ўсім свеце. Менавіта дзякуючы В. Быкаву «магутны корпус твораў пад назвай «беларуская ваенная проза», якая, на думку многіх даследчыкаў, выявіла велізарны эстэтычны патэнцыял беларускай гісторыі»[2] стаў даступны чытачам з розных краін блізкага і далёкага замежжа. Быкаўскія аповесці і апавяданні, часам маральна-філасофскія, часам прытчападобныя, дазволілі беларускай ваеннай прозе праявіцца ў развіцці новых маральных і грамадскіх катэгорый, а пытанні, пастаўленыя пісьменнікам, набылі літаратурную каштоўнасць міжнацыянальнага ўзроўню.

У цяперашні час, як мінула больш за палову стагоддзя пасля першага перакладу быкаўскіх твораў з беларускай мовы, не даводзіцца сумнявацца, што мастацкая спадчына В. Быкава заслужана стала арганічнай часткай сусветнага літаратурнага працэсу. Творы пісьменніка перакладзены на больш чым 50 моў свету, а яго творчасці прысвечаны крытычныя артыкулы і публікацыі літаратуразнаўцаў і перакладчыкаў Т. Бэрда, М. Фрэйдберга, К. Стэйнберга, М. Шнэйдмана і інш.

Надзвычайнай з'явай для беларускага літаратуразнаўства стала навуковая дзейнасць прафесара лонданскага ўніверсітэта А. Макміліна, а менавіта яго працы «Гісторыя беларускай літаратуры ад вытокаў да нашых дзён» («A History of Byelorussian Literature from its Origins to the Present Day», 1977), «Беларуская літаратура ў 1950—1960-я гады XX стагоддзя» («Belarusian Literature in the 1950s and 1960s: Release and Renewal», 2001) і тысячастаронкавая манаграфія «Напісанае ў халодным клімаце: беларуская літаратура ад 1970-х гадоў да нашых дзён» («Writing in a Cold Climate: Belarusian Literature from the 1970s to the Present Day», 2010). А. Макмілін у сваіх працах адзначае важнасць В. Быкава як пісьменніка, які ў некаторым сэнсе ўзяў на сябе «звышлітаратурную» місію захоўвання памяці пра вайну.

Тут варта задумацца, што паслужыла ключом да прыняцця мастацкага слова пісьменніка па ўсім свеце, прымаючы да

[1] Быков, В. Публицистика / В. Быков // Собр. соч. : в 4 т.— М., 1986.— Т. 4 : Знак беды : повесть ; Рассказы ; Публицистика.— С. 312—320.

[2] Тычына, М. А. Народ і вайна / М. А. Тычына.— Мінск : Беларус. навука, 2015.— 430 с.

ўвагі, што, калі вышлі першыя пераклады твораў пісьменніка за межамі Савецкага Саюза, пра беларускую літаратуру і пра В. Быкава ў прыватнасці большасць чытачоў розных краін свету мелі дастаткова цьмянае ўяўленне.

Што ж тады зрабіла В. Быкава зразумелым і ўніверсальным для чытачоў розных літаратурных традыцый? Ці мог уразіць беларускі пісьменнік англійскага чытача, які меў за сваёй спінай манументальную спадчыну Шэкспіра і Дыкенса? Ці маглі знайсці быкаўскія ідэі водгук сярод нямецкіх чытачоў, дасведчаных у Бёле, Грасе і Мане? Ці мог прабіцца быкаўскі герой, пастаўлены перад экстрэмальнай праблемай выбару, у французскую літаратуру, якая ўжо прайшла глыбокі працэс экзістэнцыялізацыі намаганнямі Г. Марсэля, Ж. П. Сартра і А. Камю? Адказ на гэтыя пытанні можна знайсці, калі зірнуць на развіццё беларускай пасляваеннай літаратуры, на засваенне ёю новых форм жыцця, авалоданне свежымі прыёмамі адлюстравання.

Светапоглядная сістэма сацрэалізму вызначалася моцным патрыятычным пасылам, але бясконцы аптымізм, разам з тым, паслабляў унутраную канфліктнасць і сюжэтную напружанасць твораў. Пры гэтым ва ўмовах пасляваеннага сацрэалізму развіццё ваеннай прозы часта не з'яўлялася прыярытэтным напрамкам у літаратуры з прычыны таго, што значна больш актуальна гучалі надзённыя пытанні аднаўлення краіны і будучыні народаў.

Прыход у беларускае мастацтва пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў 1920-я гг. XX ст. і з'яўляліся ўдзельнікамі вайны, дазволіў спалучыць патрыятычную і батальную аналітычнасць з дэталёвай псіхалагічнай характарыстыкай герояў. Экзістэнцыяльнае ўвасабленне індывідуальнага свету і свядомасці чалавека, асуджанага на маральныя пакуты, дазволіла сканцэнтраваць асноўную ўвагу на маральна-этычнай праблематыцы.

Гэта былі тыя працэсы, якія ўжо ўмацаваліся ў розных літаратурных традыцыях старога і новага свету, якія раней за беларускую літаратуру выйшлі за межы разумення ваеннай прозы як літаратурнай формы выключна пра пераможны гераізм чалавека на вайне. Важным фактарам станаўлення беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай стаў прыход шэрагу маладых пісьменнікаў — удзельнікаў вайны, стваральнікаў славутай «лейтэнанцкай прозы». Менавіта гэтых людзей В. Быкаў аднойчы назаве «забітым пакаленнем» ці «пакаленнем бязбацькавічаў» (У. Навумовіч), праводзячы паралель з мастацкай генерацыяй пісьменнікаў Першай сусветнай вайны.

Змена эстэтычнай змястоўнасці адбываецца і ў беларускай літаратуры, дзе фігура ідэальнага героя саступае месца вобразу чалавека са сваімі недахопамі, праблемамі, непадрыхтаванага да вайны, але надзеленага моцнай верай у агульначалавечае. Магістральнай думкай, якая характарызуе ўвесь пласт ваеннай прозы, становіцца тэма напружаных маральных пошукаў героя і яго духоўнага сталення, а гераіка і трагедыя вайны вызначаецца ў тым, што ў экстрэмальных абставінах маральныя і гуманістычныя крытэрыі ўзводзяцца ў ранг галоўных прынцыпаў ацэнкі чалавека.

Экзістэнцыяльнае ўвасабленне індывідуальнага свету і свядомасці чалавека, асуджанага на маральныя пакуты, дазволіла В. Быкаву сканцэнтраваць асноўную ўвагу на маральна-этычнай праблематыцы, што дапамагло пабудаваць масты ўзаемадзеяння беларускай ваеннай прозы з еўрапейскай, а таксама і амерыканскай гуманістычнай традыцыяй. В. Быкаў звяртаецца не проста да вобраза шараговага савецкага чалавека, які мог быць не зразумелым чытачу з берагоў Шпрэе ці Тэмзы, а да ўніверсальнага чалавека свету, да яго разбуранай ці, наадварот, вызваленай ад гнёту душы, трагедыя якога не абмяжоўвалася пэўнымі ідэалагічнымі ці палітычнымі рамкамі, а разглядалася з боку агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей. Аўтар першай англамоўнай біяграфіі пісьменніка прафесар Універсітэта Ватэрлоа (Канада) З. Гімпелевіч у сваёй кнізе «Васіль Быкаў: Жыццё і лёс» (Vasil Bykaŭ: His Life and Works, 2011) узгадвае словы амерыканскага вучонага-бе-

Віктар ШНІП

Быкаў і Быкава

Пісаць тое, што Васіль Быкаў — вялікі пісьменнік,— нічога не напісаць. Аналізаваць яго творы — трэба быць літаратуразнаўцам гэткага ж узроўню, як і сам пісьменнік. У мяне ёсць толькі ўспаміны...

Я меў шчасце, працуючы ў «ЛіМе», некалькі разоў быць дома ў Васіля Уладзіміравіча, прыносячы яму карэктуру публікацый інтэрв'ю з ім. І пасля таго, як не стала Быкава, я хадзіў да яго жонкі Ірыны Міхайлаўны, каб атрымаць згоду на публікацыі яго твораў. І цяпер, калі адзначаецца 100-годдзе з дня народзінаў Васіля Быкава, я прапаную чытачам «Маладосці» некаторыя запісы са свайго дзённіка, якія дададуць да яго вядомага партрэта яшчэ некалькі новых штрыхоў.

3.06.1983. Хадзіў на вечар «Маладосці», прысвечаны 30-годдзю часопіса. Святкаванне праходзіла ў Доме літаратара. Я прыйшоў загадзя, і мяне, каб не блытаўся сярод гасцей і наогул каб не ўцёк, Леанід Дайнека адвёў у кабінет літкансультантаў. Там быў Васіль Быкаў, якога я адразу пазнаў. Сказаўшы «Добры дзень», я сеў на вольнае крэсла. Васіль Уладзіміравіч, агледзеўшы мяне, грозна запытаўся: «Хто ты такі?!» — «Паэт. Віктар Шніп...» — нясмела адказаў я. «Ну калі паэт, то сядзі!» — весялей сказаў Васіль Быкаў і пачаў распытвацца, адкуль я, хто мае бацькі, чым займаюся...

Вечар здымала тэлебачанне. Васіль Быкаў вёў імпрэзу.

22.01.2010. Вярнуўся сын з экскурсіі. Іх клас вадзілі ў Нацыянальную бібліятэку. «Чаму так доўга?» — пытаюся. «Пасля экскурсіі я з Іллём Дубоўскім хадзіў яшчэ на могілкі...» — адказвае Максім. «Такім марозам! На якія?» — незадаволена бурчу. «Да Быкава, Караткевіча...» — тлумачыць сын. І я маўчу...

27.06.2013. Быў у Ірыны Міхайлаўны Быкавай. Насіў на подпіс дамову на выданне кнігі «Пакахай мяне, салдацік» Васіля Быкава. Ішоў з нейкай незразумелай трывогай, нават са страхам, што яна адмовіцца ад выдання кнігі ў «Мастацкай літаратуры». Хваляванне было дарэмным. Ірына Міхайлаўна сустрэла з даверам, адразу ж прапанавала пачаставацца. Я адмовіўся, бо прыйшоў па справе. Учора ў Ірыны Міхайлаўны ў гасцях было 16 чалавек, і яна недзе паклала акуляры і цяпер дрэнна бачыць, таму я паказваў, дзе распісацца, і яна распісвалася. Завёўшы ў кабінет Быкава, сказала: «Музейцы хацелі ўсё забраць, каб вызваліць кабінет. Я адмовілася, бо тут душа Васіля Уладзіміравіча!» У кніжнай шафе за шклом на паперы фламастарам напісана: «Бывай, родная хата! Вітанне новым гаспадарам! Васіль Быкаў. 20.07.2000 г.». «Гэта Васіль напісаў, калі пакідаў назаўсёды кватэру. Ён адчуваў, што ўжо ніколі сюды не вернецца, хоць пасля гэтага пражыў яшчэ тры гады. Калі ў вас ёсць якія аўтографы Быкава, то прынясіце мне — я іх збіраю для музейнай экспазіцыі». Пасля паўгадзіннай размовы мы дамовіліся, што як выйдзе кніга, то прынясу пару экзэмпляраў. Развітваючыся, Ірына Міхайлаўна выйшла за мной на лесвічную пляцоўку і сказала: «Прыходзьце ў госці з жонкай! Не забывайцеся!» А я, вяртаючыся на працу, падумаў: «Вось такімі душэўнымі і гасціннымі, як Ірына Міхайлаўна, павінны быць жонкі ў пісьменнікаў!»

12.03.2014. Ізноў хадзіў да Быкавай. Сустрэла мяне Ірына Міхайлаўна з загадзя адчыненымі дзвярыма, як даўняга добра знаёмага. Прапаноўвала пачастунак. Я адмовіўся, каб не загружаць гаспадыню клопатамі пра мяне. Кніжка «Пакахай мяне, салдацік» ёй спадабалася. Папрасіла, каб напісаў на адным з асобнікаў сённяшнюю дату і распісаўся. Цяпер Ірына

Анкета

«Мой Быкаў»

1. Ці памятаеце, з якіх твораў пачалося ваша знаёмства з творчасцю Васіля Быкава? Згадайце вашы ўражанні.

2. Якія факты біяграфіі народнага пісьменніка вас зацікавілі?

3. Найбольшую вядомасць Васіль Уладзіміравіч атрымаў як празаік. Ці чыталі вы яго п'есы, глядзелі фільмы па яго сцэнарыях?

4. Што вы ведаеце пра яго як мастака?

5. Які з герояў Васіля Быкава запомніўся вам больш за ўсё?

6. Ці адгукаюцца ў сённяшняй моладзі творы класіка? Ці застаюцца актуальнымі тэмы?

Ігар Шаладонаў,

вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

1. Памяць — рэч вельмі выбіральная і канкрэтная, калі што западзе чалавеку, асабліва на асацыятыўным узроўні, то застаецца надоўга яго спадарожнікам жыцця. І, магчыма, калі б мяне спыталі, ці памятаю я моманты і кніжкі іншых беларускіх пісьменнікаў і калі з імі пазнаёміўся, то я б, напэўна, на гэта пытанне не адказаў бы з поўнай дакладнасцю.

А вось з творчасцю Васіля Быкава мая памяць захавала выразную свядомую дакладнасць. Па-першае, гэта звязана з колерам кніжак яго двухтомнага выдання 1974 года. Такія дзве даволі пухлыя шэра-светла-сіняга колеру кніжкі, як

Марыля Буйна,

студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, паэтка

1. Маё знаёмства з творчасцю Васіля Быкава адбылося ў восьмым класе, калі мы вывучалі «Жураўліны крык». Тады я не цікавілася беларускай літаратурай, але прачытала аповесць загадзя. Яна — адзіны твор, якія запомніўся мне са школьнай праграмы да дзявятага класа. Мяне зачапіла тое, што Быкаў паказваў людзей падчас вайны такімі, якія яны былі. Апісваў іх клопаты, іх разважанні, успаміны, страхі — такія, якія маюць звычайныя, жывыя людзі. Уразілі розныя тыпы герояў, асабліва запомніліся Фішар і Пшанічны. Дагэтуль я ў ваенных творах рэдка сустракала і інтэлігентаў, і здраднікаў, якіх можна было зразумець (не паспачуваць, але зразумець).

2. У той жа школьны час мяне асабліва зацікавіла тое, што Васіль Быкаў паступіў у мастацкае вучылішча. Бо неяк гэта ўсё не вязалася ў галаве падлетка: беларускі пісьменнік — экзістэнцыяліст — хацеў быць скульптарам. Назаўжды запомнілася, што Быкава памылкова запісалі як загінулага. Гэта нават мяне спалохала. Магчыма, таму, што мой прадзед загінуў на савецка-фінскай вайне і я ведала, якія страшныя пачуцці неслі з сабою праз усё жыццё яго матка, жонка і дзеці.

3. Не, не даводзілася.

4. Толькі тое, што ён вучыўся ў мастацкім вучылішчы.

5. Фішар з «Жураўлінага крыку». Марныя ахвяры — самыя праўдзівыя героі.

6. Насамрэч, па маіх назіраннях, збольшага моладзі Быкаў не цікавы. У значнай ступені гэта таму, што ў нас занадта традыцыйна выкладаюць творы пра Другую сусветную і Вялікую Айчынную вайну. Настаўнікі хочуць, каб пакаленне, ужо далёкае ад той вайны, адчувала яе так, як адчуваюць дзеці колішніх салдат або дзеці, чыё жыццё было скалечана вайною. Трэба прызнаць, што гэта немагчыма. Але Быкаў нездарма з'яўляецца самым вядомым беларускім пісьменнікам XX стагоддзя. Ён перадусім экзістэнцыяліст. І сённяшняй моладзі яго трэба прэзентаваць з гэтага боку. Менавіта праз гэта яго творы застаюцца актуальнымі: жыццё кожнага асобнага чалавека не стала лёгкім, мы ўсё яшчэ павінны рабіць выбар, часта — занадта сур'ёзны, занадта цяжкі для нашай будучыні. Аповесці і апавяданні Быкава — пра чалавека, пра кожнага з нас. Мы мусім успрымаць іх як творы з глыбокім псіхалагізмам (для простага чытача) і як магчымасць задумацца пра свае маральныя арыенціры (для тых, каму не хапае рэальнага жыцця). Калі мы задумаемся, то зразумеем, што нашыя пытанні да саміх сябе, да герояў, да аўтара не проста пра канкрэтную гістарычную эпоху. Яны пра чалавека. Пра тое, што мы лічым правільным, што мы можам зразумець, а што не можам.

Я запомніла адну размову з маёй школьнай настаўніцай. Яна сказала пра тое, што цяперашні юнак ацэньвае той час з пазіцыі пацыфізму і інтэрнацыяналізму, блізкасці ўсіх людзей паміж сабою. І ў пэўным сэнсе гэта правільна. Гэта тое, што ўхваліў бы наш Васіль Уладзіміравіч. Тады так было немагчыма. І гэта такса-

ма правільна. Менавіта дзякуючы такім пісьменнікам-рэалістам, як Быкаў, мы можам узняцца над тым часам і паглядзець на людзей з іншага боку. Асабліва на саміх сябе. Напрыклад, на здраднікаў. Мы схільныя выкрэсліваць іх са свайго народа, рабіць выгляд, быццам гэта не частка нас. А я лічу, што Юду трэба ўспрымаць як асобнае поле бою, дзе таксама ідзе сваё супрацьстаянне. Я не кажу, што здраду трэба апраўдваць. Але на яе трэба паглядзець з пазіцый увагі да чалавека.

Усё ж асабіста для мяне надта важна тое, што ў Быкава пазіцыя «вайна — гэта зло і духоўны крызіс». Быкаў не малюе герояў, ён малюе людзей. Ён са свайго досведу гаворыць, што ворагі могуць быць паўсюль: гэта як немцы, так і калабаранты, «смершаўцы» і проста паклёпнікі са «сваіх». І стаўленне Быкава, бясспрэчна, правільнае і патрэбнае. Гэта тое, што мы павінны ведаць.

Тамара МАЗУР,

паэтка, публіцыст

1. На працягу свайго жыцця я некалькі разоў перачытвала аповесці Васіля Быкава, кожны раз балюча пражываючы разам з пісьменнікам супярэчлівыя лёсы яго літаратурных герояў. Аднак паспрабую згадаць першыя ўражанні.

Для юнай паэткі, якая часцей за ўсё пісала пра каханне, найбольш зразумелай была «Альпійская балада». Вядома, чытаць без слёз гэты твор было немагчыма, але я магла ўсё прыняць і патлумачыць. Не зразумелай мне падалася тады аповесць «Сотнікаў». Адчувала сябе загнанай у куток з-за таго, што мой любімы герой Рыбак у канцы аповесці стаў антыгероем, здраднікам, а Сотнікаў, які толькі раздражняў на працягу многіх старонак, выйшаў пераможцам у сваіх развагах і маральным выбары.

Гэта было, напэўна, першае расчараванне ў маім жыцці, якое прымусіла спыніцца, задумацца пра каштоўнасць жыцця і яго залежнасць ад абставін і волі чалавека.

Нядаўна зноў перачытала «Сотнікава». І наноў адчула шок, але не дзявочы, а мацярынскі. Думаецца, што кожная маці, якая вырасціла сына, пагодзіцца з такімі быкаўскімі радкамі: «Цяпер, у апошнія імгненні свайго жыцця, ён нечакана ўсумніўся ў сваім заўсёдным праве — нароўні з сабой патрабаваць ад іншых».

2. Згадалася, як мой выкладчык замежнай літаратуры Вячаслаў Антонавіч Лазоўскі казаў, што часцей за ўсё ва ўнікальнага пісьменніка бывае незвычайны лёс.

У Васіля Быкава лёс франтавіка. Ён удзельнічаў у цяжкіх баях на Паўднёва-Заходнім фронце, быў двойчы паранены, а пасля вайсковага вучылішча ў якасці камандзіра стралковага ўзвода ваяваў ва Украіне, Румыніі да самай Перамогі. І... маляваў. Франтавыя графічныя малюнкі Васіля Быкава кранаюць рэалізмам і Божай іскрай, якія пакладзены і ў аснову празаічных твораў пра перажытую ім вайну.

Шмат гадоў Васіль Уладзіміравіч жыў у Гродна. Цікава, што пасля мабілізацыі ў 1947-м ён працаваў у рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда», аднак з 1949-га па 1955 год зноў служыў у Савецкай Арміі і звольніўся ў запас у званні маёра.

Вярнуўшыся ў «Гродзенскую праўду», працаваў стыльрэдактарам, літкансультантам, а з 1972-га па 1978 год (да пераезду ў Мінск) быў сакратаром Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР. Чвэрць стагоддзя народны пісьменнік жыў у нашым горадзе над Нёманам, тут ён заявіў пра сябе як публіцыст, празаік і сцэнарыст. Таму мы лічым яго больш нашым, гарадзенскім, чым магілёўскім.

3. У музеі нашай абласной газеты «Гродзенская праўда» захоўваецца арыгінал рэжысёрскай распрацоўкі Васіля Быкава кінафільма «Абеліск». На жаль, чытаць яго п'есы мне не даводзілася. А фільмы глядзела, многія, асабліва запомніліся «Альпійская балада», «Дажыць да світання», «Воўчая зграя».

4. Пра арыгінальныя копіі яго франтавых малюнкаў алоўкам у 2020 годзе пісалі як пра сенсацыю многія газеты і сеткавыя выданні. Почырк мастака Васіля Быкава мне падаецца непадробным. Найбольш падабаецца яго мірны малюнак «Уезд у Вушачу», які захоўваецца ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

5. Чамусьці хлопчык у будзёнаўцы ў «Сотнікаве». Мо таму, што ён у фільме такі, якім я яго ўяўляю, чытаючы аповесць, што бывае вельмі рэдка.

6. Тэмы і філасофія жыцця Васіля Быкава будуць хваляваць людзей да таго часу, пакуль на нашай планеце ідуць войны. Сучаснай моладзі варта не толькі глядзець фільмы паводле аповесцей Васіля Быкава, але перш за ўсё чытаць яго на беларускай мове.

Андрэй Дарожкін,

бібліятэкар, паэт

1. Маё знаёмства з творчасцю Васіля Быкава пачалося даволі звычайна: удумліва і асэнсавана я прачытаў яго апавяданні і аповесці («Жураўліны крык», «Жоўты пясочак» і іншыя), калі яны з'явіліся ў вучэбнай праграме ды, адпаведна, у хрэстаматыях па беларускай літаратуры ў школе.

А вось знаёмства з самім Васілём Уладзіміравічам (дакладней, з асобай творцы) адбылося значна раней і запомнілася больш дэталёва. Я пераходзіў у чацвёрты клас. Мы з братам, які старэйшы за мяне амаль на шэсць гадоў, ды яго сябрамі атрымалі кніжныя камплекты на новы навучальны год. Канешне, скарыстаўшыся момантам, я з цікавасцю праглядзеў не толькі свае падручнікі — і «забег» на некалькі школьных гадоў наперад.

КАСТУСЬ ЛЕШНІЦА

Беларуская літаратура ў свеце: з хронікі літаратурнага жыцця ў 1966–1985 гг.

Першая частка

Сённяшнія стасункі паміж пісьменніцкімі супольнасцямі не дужа шырокія. Інтэрнэт, сацыяльныя сеткі выбудавалі нейкую, калі так можна сказаць, маргінальную лінію гэтых стасункаў. Той сістэмнасці, паслядоўнасці, якая была дасягнута ў другой палове XX стагоддзя, ужо няма. Дарэчы, напрыканцы XX стагоддзя яна ж, сістэмнасць, пачала і разбурацца...

Дзякуючы старонкам «Хронікі літаратурнага жыцця (1966—1985)» (ці вядзе сёння якая навуковая структура такую хроніку ў дачыненні да першай чвэрці XXI стагоддзя?!), змешчанай у першай кнізе чацвёртага тома «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» (унікальнае выданне!), давайце паспрабуем прасачыць хаця б галоўныя падзеі ў стасунках беларускай літаратуры з усім светам.

1966 год. 25 студзеня ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў праводзіцца літаратурны вечар да 100-годдзя з дня нараджэння Рамэна Ралана (1866—1944). На свяце, прысвечаным лаўрэату Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1915), выступіў з дакладам Іван Мележ. А ўступнае слова прамовіў Пятрусь Броўка. Нагадаем, што яшчэ ў 1936—1937 гг. у Мінску па-беларуску выйшлі тры кнігі Рамэна Ралана. Сярод перакладчыкаў — Ян Скрыган.

17—26 красавіка праводзіцца Дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ва Узбекістане. Урачыстае адкрыццё прайшло ў Ташкенцкім Палацы мастацтва. Газета «Літаратура і мастацтва» надрукавала артыкул Аляксея Кулакоўскага «Ташкенцкія сустрэчы». Дарэчы, 26 красавіка ў Ташкенце адбыўся землятрус... Якраз з Узбекістанам і сёння складваюцца неблагія адносіны. У апошнія гады ў Ташкенце пабывалі пісьменнікі Алесь Карлюкевіч, Алена Стэльмах, Зіновій Прыгодзіч, Іна Фралова, Іван Саверчанка. Беларусь наведалі Сіражыддзін Саід, Мікалай Ільін, Рысалат Хайдарава і іншыя ўзбекскія літаратары. У 2023 г. у Мінску былі праведзены Дні ўзбекскай літаратуры. У Ташкенце выйшла кніга твораў Якуба Коласа на ўзбекскай мове.

30 жніўня 1966 г. у Мінску ў клубе пісьменнікаў адбылася сустрэча з англійскім паэтам і перакладчыкам Уолтэрам Мэем (1912—2006). Ён з'яўляецца перакладчыкам амаль 100 вершаў Янкі Купалы. У 1976 г. у яго перакладах выйшла анталогія сучаснай беларускай паэзіі «Цудоўны край Беларусі». У 1982-м — кнігі Якуба Коласа і Янкі Купалы ў яго перакладах... Магчыма, прыйдзе час — і будзе створана навуковая біяграфія Уолтэра Мэя. Яна проста павінна выйсці ў Беларусі!

9 верасня адбылося пасяджэнне ССП (Саюза савецкіх пісьменнікаў) БССР, на якім быў створаны Камітэт салідарнасці пісьменнікаў Беларусі з народам В'етнама. У 1955—1975 гг. ішла Другая Індакітайская вайна — узброены канфлікт у В'етнаме, Лаосе і Камбоджы. У гэтай вайне былі задзейнічаны 485 300 салдат і афіцэраў ЗША. Якраз 7 верасня Міністэрства абароны ЗША аб'явіла пра самы буйны з часоў Карэйскай вайны прызыў на вайсковую службу... У 1960—1980-я гг. у беларускай перыёдыцы з'явілася шмат публікацый твораў в'етнамскіх пісьменнікаў, выйшаў шэраг асобных кніг. У тым ліку — і «Турэмны дзённік» Хо Шы Міна ў перакладзе Янкі Сіпакова.

6—12 кастрычніка прайшоў Тыдзень таджыкскай літаратуры ў Беларусі.

Фота з сайта Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы

З Таджыкістанам, таджыкскай літаратурай у 2008—2020 гг. таксама няблага складваліся стасункі і ў Саюза пісьменнікаў Беларусі, і ў Выдавецкага дома «Звязда». У Душанбэ ў гэты перыяд выйшлі на таджыкскай мове кнігі Юрыя Сапажкова, Алеся Бадака, Міколы Мятліцкага, Алеся Карлюкевіча і іншых паэтаў і празаікаў. Выйшла анталогія перакладаў з беларускай дзіцячай літаратуры на таджыкскай мове. Перакладчыкам выступіў Салім Хатлані, які доўгі час працаваў у таджыкскім пасольстве ў Беларусі. А ў Мінску — кнігі Ато Хамдама і Леаніда Чыгрына. У Саюз пісьменнікаў Беларусі прынялі народнага пісьменніка Таджыкістана Ато Хамдама. У Мінску пабываў старшыня Саюза пісьменнікаў Таджыкістана, перакладчык шэрагу п'ес Аляксея Дударава на таджыкскую мову Нізом Касім. Усе гэтыя і іншыя крокі беларуска-таджыкскага літаратурнага пабрацімства сталі магчымымі дзякуючы старанням асобных літаратараў: у Душанбэ — Ато Хамдама, у Мінску — Ірыны Качатковай, Алеся Карлюкевіча.

У лістападзе 1966 г. Прэзідыум Народнага Сходу Народнай Рэспублікі Балгарыі ўзнагародзіў Ніла Гілевіча ордэнам Кірыла і Мяфодзія I ступені за творчыя здзяйсненні ў галіне перакладу балгарскай паэзіі на беларускую мову... Дзясяткі кніг беларускіх пісьменнікаў пабачылі свет у Балгарыі. Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Янка Купала, Якуб Колас, Іван Шамякін... Імёнаў не пералічыць! Што можна сёння сказаць пра беларуска-балгарскія літаратурныя сувязі на сучасным этапе?.. Некаторы час назад у Балгарыі жыла і працавала пісьменніца і літаратуразнаўца Роза Станкевіч. Яна пражыла 27 гадоў у Беларусі, а пасля вярнулася на радзіму. У Мінску абараніла дысертацыю «Янка Купала ў Балгарыі». У Варне ў 2005 г. надрукавала манаграфію «Янка Купала, Якуб Колас і Максім Багдановіч у Балгарыі». Сёння прыкладаў такога апантанага служэння кампаратывістыцы, відавочна, не шмат. Хаця зараз у Балгарыі жыве і працуе беларуская пісьменніца і мастачка Ганна Ціханава-Йарданова.

16—17 снежня ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР прайшла нарада па праблемах параўнальнага літаратуразнаўства, літаратурных сувязей. Мяркуючы па прозвішчах (Э. Георгіеў, М. Урублеўскі, В. Вавера...), прынялі ўдзел і замежныя навукоўцы і літаратары. Згадка пра гэтую нараду падводзіць да думкі, што рэсурсным

цэнтрам па развіцці новага этапу міжнародных літаратурных сувязей мог бы стаць Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Будзем на гэта спадзявацца!

Такім быў 1966 год у беларускай літаратуры з пункту гледжання міжнародных, міжнацыянальных стасункаў беларускага прыгожага пісьменства. Праўда, інфармацыя ў «Хроніцы...» усё ж даволі сціплая і стасункі, зразумела, былі шмат шырэйшыя. Іншая справа, што не ўсё навідавоку аказвалася. Ды і задача стваральнікаў «Хронікі...», відавочна, была ў іншым — паказаць агульныя рысы літаратурнага працэсу, вылучыць найболей знакавае, актуальнае. Тут заўсёды важную ролю іграюць медыя. Не напісалі ў «ЛіМе», напрыклад, пра тую ці іншую паездку, пра тое ці іншае выданне твораў беларускага пісьменніка за межамі роднай Беларусі — ужо як быццам (на крайні выпадак — для тых, хто будзе па «Хроніцы...» вывучаць літаратурны працэс) і не было падзеі. Зразумела, шматаблічнымі і багатымі ў 1966 г. былі стасункі з Расіяй, рускімі пісьменнікамі, расійскімі выдавецтвамі, нацыянальнымі літаратурамі Расійскай Федэрацыі. Гэтую тэму «Хроніка...» абмінае. Відаць, не наўмысна...

Літаратурныя сувязі, пранікненне ў іншанацыянальны свет у значнай ступені залежныя ад індывідуальнай актыўнасці творцаў. Як прыклад у дачыненні да нашай тэмы — стасункі Рыгора Барадуліна ў 1966 г. з пісьменнікамі іншых краін і іншых рэспублік СССР. 27 студзеня паэт завяршае пераклад вершаў узбекскай паэтэсы Зульфіі (1915—1996). Відаць, для кнігі «Лірыка», якая выйдзе ў Мінску ў 1967-м. І лаканічныя запісы ў барадулінскім дзённіку за 1966 год: «10 лютага. Узбекі... 15 лютага. Здаць Вярцінскаму ўзбекаў...» І далей: «5 сакавіка... Прыезд Стулпана...» І да 9 сакавіка — другія згадкі пра Стулпана... Еранім Стулпан (1931—1981) — латышскі паэт, празаік, публіцыст. У тым жа сакавіку Рыгор Іванавіч пазначае гасцяванне ў Мінску і іншых пісьменнікаў — з Латвіі і Чэхаславакіі. У маі беларускі паэт ляціць у Рыгу. У чэрвені Барадулін — ізноў у Латвіі. На старонках запісаў за 1966 г. — згадкі Барадуліна пра рускіх паэтаў Яраслава Смелякова, Міхаіла Дудзіна, празаіка і драматурга Барыса Дзьякава, армянскага пісьменніка Вардгеса Петрасяна, балгарскага паэта і перакладчыка Найдэна Вылчава...

1967 год. З «Хронікі...». У сакавіку, як паведамляе «ЛіМ» 28 сакавіка, адбыўся вечар, прысвечаны 125-годдзю з дня смерці Стэндаля, французскага пісьменніка. 4 ліпеня «ЛіМ» друкуе артыкул І. Сцяпуніна «Перапіска П. Шэйна з рускімі пісьменнікамі». Павел Васільевіч Шэйн (1826—1900) — рускі і беларускі этнограф, лінгвіст, фальклярыст. Нарадзіўся ў Магілёве. У Маскве пазнаёміўся з рускім крытыкам Сцяпанам Шэвыровым, публіцыстам і паэтам Канстанцінам Аксакавым, паэтам і мастаком Аляксеем Хамяковым.

Вось, здаецца, і ўвесь «міжнародны» год беларускай літаратуры. А між тым у Маскве і ў рэспубліках СССР выходзяць кнігі беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на рускую і іншыя мовы, здзяйсняюцца замежныя творчыя паездкі, у Мінск наведваюцца літаратары з іншых краін.

Хаця... Часопіс «Полымя» ў лютаўскім нумары за 1967 год паведамляе: «Нядаўна Дзяржвыд Мангольскай Народнай Рэспублікі ва Улан-Баторы выпусціла зборнік вершаў паэтаў нашай рэспублікі «Букет беларускіх красак», у які таксама ўключаны шырокавядомыя вершы А. Куляшова». Магчыма, гэтае шматзначнае «нядаўна» адносіцца і да 1966-га...

У 1967 г. падборкі твораў беларускіх паэтаў выходзяць у маскоўскіх часопісах «Знамя», «Новый мир». «Литературная газета» да Дзён культуры і мастацтва Беларусі ў Маскве друкуе вершы П. Броўкі, Р. Барадуліна, П. Панчанкі, У. Караткевіча, А. Куляшова ў перакладзе на рускую мову. Падборка твораў беларускіх празаікаў і паэтаў друкуецца ў чувашскім часопісе «Сцяг». Варта заўважыць, што ў 2020—2024 гг. у чувашскім часопісе «Ончыко» («Наперад») з года ў год змяшчаюцца пераклады беларускіх класікаў і сучасных літаратараў на чувашскую мову. З апошніх прыкладаў — публікацыя ў сакавіцкім нумары паэмы Янкі Купалы «Курган» у перакладзе

ЛІТАРАТУРНЫ СВЕТ

МІКОЛА МІКУЛІЧ

«Думкі рвуцца, быццам ніткі...»

Да 30-годдзя выдання зборніка Максіма Танка «Мой каўчэг»

Нядаўна наша грамадскасць урачыста адзначыла 110-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, выдатнага грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Максіма Танка. У Дзяржаўным літаратурным музеі гісторыі беларускай літаратуры была наладжана фотавыстава, прысвечаная гэтай юбілейнай даце, Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з Мядзельскім раённым выканаўчым камітэтэтам арганізавалі і правялі на радзіме паэта, у Мядзелі, Рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...», матэрыялы якой пабачылі свет у выдавецтве «Беларуская навука» ў лютым бягучага года.

Сёлета спаўняецца роўна 30 год з дня выдання апошняга прыжыццёвага зборніка М. Танка «Мой каўчэг»[1], які выйшаў у 1994 г. (падпісаны да друку 19.05.1993. Ул.-выд. арк 5,11. Тыраж 11600 экз.) і з'яўляецца калі не самай лепшай, дык адной з самых лепшых кніг беларускай паэзіі канца XX ст.

Сваім зместам і пафасам зборнік «Мой каўчэг» цалкам звернуты да ўсяго багацця і шматстайнасці жыцця на зямлі, адлюстравання з'яў і працэсаў беларускай рэчаіснасці, выяўлення духоўнага свету асобы беларуса. Тут знаходзім згадкі пра мінулае, пра некалі пройдзеныя шляхі і дарогі лірычнага героя паэта, перажытыя падзеі, асэнсаванне бягучых праблем і супярэчнасцей, сацыяльных змен, якіх у канцы 1980 — пачатку 1990-х гг., як вядома, хапала, пэўныя праекцыі будучыні — шырокі сацыяльна-гістарычны дыяпазон, багацце і разнастайнасць жыццёвых падзей, калізій, здарэнняў і сітуацый, россып парадаксальных думак і назіранняў аўтара... І ўсё гэта — у выдатным ідэйна-эстэтычным, мастацка-вобразным танкаўскім увасабленні, прасякнутым тонкім адчуваннем беларускай нацыянальнай матэрыі слова, яго высокай духаноснай энергетыкі, вялікага творчага патэнцыялу і ўмоўна-асацыятыўных магчымасцей. У анатацыі да зборніка, па ўсім відаць, падрыхтаванай яго рэдактарам Л. В. Дранько-Майсюком, слушна падкрэслена: «Кніга Максіма Танка «Мой каўчэг» — плённы вынік апошніх чатырох гадоў работы паэта. У ягоных вершах заўсёды эстэтыка суладнічае маралі, слова адпавядае музыцы, эмацыянальны жэст — думцы. І ў свае патрыяршыя восемдзесят гадоў Максім Танк усё той жа майстар, які здзіўляе сваім талентам не адно пакаленне чытачоў».

Мы бачым, лірычны герой М. Танка — далёка не шараговая асоба. Гэта чалавек, якому давялося жыць у некалькіх краінах, пры розных дзяржаўных уладах і грамадскіх сістэмах, ён праз многае прайшоў, шмат што бачыў на сваім вяку, шмат зведаў і перажыў, і яму ёсць пра што распавесці чытачу. За плячыма лірычнага героя паэта — гады багатага на з'явы, падзеі і адкрыцці ўражлівага маленства спачатку ў царскай, а затым у Савецкай Расіі, у Маскве, смелага, рызыкоўнага, рамантычнага юнацтва «за польскім часам», у міжваеннай Вільні, заходнебеларускіх Віленшчыне і Навагрудчыне, поўных цяжкіх нягод і выпрабаванняў ваенных шляхоў і паходаў. Вельмі характарыстычна і красамоўна гучаць наступныя вобразныя радкі М. Танка:

Я прайшоў праз кастры інквізіцый,
Праз лясы мячоў і алебардаў,
Праз руіны надзей і цямніцы,
Праз часы цемрашальства, пагарды.

(«Я прайшоў праз кастры інквізіцый...», 1991)

[1] Танк, М. Мой каўчэг : вершы. 1989 — 1992 / Максім Танк. — Мінск : Маст. літ., 1994. — 207 с.